
Палескія матывы ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ЮРЫСТ РАІЦЬ
Пятро Юшчук ☞ 11

http://niva.iig.pl/
redakcja@niva.iig.pl

№ 5 (2490) Год XLIX Беласток, 1 лютага 2004 г. Цана 2,00 зл.

Сеймавая камісія меншасцей не падпісваецца на меншасную прэсу ўвогуле, бо nie ma takiego zwyczaju. Падляшскія ўстановы — таксама не, бо трэба ім фінансава zaciskać pasa. Чынавенства скупейшае за бедны народ?

Ашчаднасць на беларусах?

Мацей Халадоўскі

Шмат з тых, хто выказваецца аб беларускіх праблемах альбо хоць бы на сваёй працы з імі сустракаецца, прызнаецца, што калі ўжо і чытае часопісы беларусаў, то купляе іх за свае грошы альбо атрымлівае прыватным шляхам.

Хто як хто, але ўпаўнамочаны па справах меншасцей падляшскага ваяводы Марэк Лібэрадзкі павінен *z urzędu* рэгулярна сачыць, хоць бы пры дапамозе перакладчыкаў, за меншаснай прэсай рэгіёна. Але, на жаль:

— Наша ўстанова не ў змозе гэта рабіць, — прызнаецца.

Не лепш у Падляшскай маршалкоўскай установе. Маршалкава прэс-інфарматарка Бажэна Бэднарэк запэўнівае:

— Не падпісваемся, бо скарацілі сродкі на тыя мэты, але чытаем.

Хто чытае? Не вельмі вядома. Мабыць, гаворка аб члене падляшскай управы Яне Сычэўскім, па-за ўстановай — старшыні Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Без сумнення, *ściśle kierownictwo* інфармацыйнага бюро — не, бо як калісь прызналася ў размове з „Нівай" Бажэна Бэднарэк, яна „разумее беларускую мову, але мае праблемы з чытаннем" на мове найбольшай у рэгіёне нацыянальнай меншасці. Не мае на стале „службова" ані „Нівы", ані „Часопіса", ані „Przeglądu Prawosławnego", падлеглы маршалкоўскай установе Ваяводскі асяродак анімацыі культуры, асабліва ангажаваны ў прапагандаванне меншаснай культуры. Ягоная віцэ-дырэктарка Барбара Пахольская асабліва шчырая:

— А нашто падпісвацца — каб ляжала? У нас толькі адна асоба чытае па-беларуску — шафёр.

А замест — кантакт

Не падпісваюцца таксама на беларускую прэсу самаўраднікі паўднёва-ўсходніх тэрыторый Беласточчыны. У большасці прызнаюцца, што па фінансавых прычынах. Купляюць некаторыя польскамоўныя мясцовыя і цэнтральныя газеты.

— Не падпісваемся. Не ведаю, чаму. Сам я чытаю. Першая крыніца інфармацый аб беларусах гэта само сутыкненне з імі, — кажа бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк.

— Не падпісваемся. Перш за ўсё кантактуемся з асяроддзем, якое, як відаць, тут не меншасць, — тлумачыць Уладзімір Пятрочук, гайнаўскі староста.

Падобна і ў гміннай установе і старостве ў Бельску-Падляшскім. Сакратар Бельскага павета Рышард Анусевіч дадае:

— Я карыстаюся гэтай прэсай індывідуальна.

Таксама, для прыкладу, у Міхалове ці Чаромсе.

— Я сам купляю. Як ашчаднасць, дык ашчаднасць, — сцвярджае чаромхаўскі войт Міхал Врублеўскі.

— Не падпісваемся, але рэгулярна кантактуемся з праваслаўнай парафіяй. З таго, што ведаю, беларускамоўны друк ёсць у нашай гміннай бібліятэцы, — прызнаецца ў сваю чаргу Збігнеў Тохвін, сакратар Управы горада Саколкі.

У сталіцы рэгіёна асабліва на гэтую тэму не мае ахвоты размаўляць шматгадовы работнік прэсавага бюро правага прэзідэнта Беластока Лешак Калеснік:

— Наколькі я ведаю, дык не падпісваемся, але праверу.

Праверыў:

— Не.

Адкуль тады прэзідэнт Рышард Тур чэрпае веды аб беларусах-жыхарах Беластока — яму толькі вядома, ну, можа, яшчэ ягонаму палітычнаму заплечу з каталіцка-нацыянальных партый.

Не маюць нават дзяржаўныя ўстановы

Інфармацыю аб беларусах пасрэдна праз друк мае падляшскі куратар асветы і выхавання.

— Нашы візітатары, якія займаюцца школамі, дзе навучаецца меншасным мовам, напэўна чытаюць гэту прэсу. Калі даходзіць да нейкай праблемы, інфармуюць аб гэтым. Не ведаю, ці мы павінны атрымліваць яе, — адказвае прэс-інфарматарка кураторыі Гражына Цітко.

Прэс-інфарматары іншых устаноў, якія сутыкаюцца з беларусамі і іншымі меншасцямі рэгіёна мяркуюць гэтак:

— Не падпісваемся, з-за ашчаднасці. Але, на маю думку, павінны, — кажа прэс-інфарматарка Падляшскай часці Памежнай службы паручнік Анна Валошын-Врона.

— Не, — коратка адрэзвае прэс-інфарматарка рэгіянальнай дэлегатуры Агенцтва ўнутранай бяспекі, хоць такое перакананне, мабыць, найменш што дзіўнае, бо для ABW меншасная прэса здаецца быць адной з важнейшых крыніц інфармацый.

Не маюць на сваіх паліцах беларускіх газет таксама беластоцкія вышэйшыя навучальныя ўстановы. Крыху інакш у бібліятэцы Гуманітарнага факультэта Універсітэта ў Беластоку. Яе кіраўнік Гражына Крушэўская пералічвае:

— Атрымліваем у падпісцы па адным экземпляры „Нівы", а ў дары „Czasopis" ды „Przegląd Prawosławny". Не маем літоўскай „Аўшры". Часам трапляе да нас украінская газета „Над Бугом і Нарвою".

Чытаю, не чытаю

Па-рознаму з чытаннем беларускага і шырэй меншаснага друку нашага рэгіёна сярод падляшскіх парламентарыяў. Парламенцкія клубы ў Сейме і Сенаце і парламенцкія бюро іх не атрымліваюць.

— Не чытаю „Нівы", бо ж не ведаю мовы. Калі б хоць некаторыя артыкулы паказваліся па-польску, то ахвотна прачытала б, — адкрыта кажа дэпутатка ад СЛД Барбара Цірук, шматгадовая журналістка, член Сеймавай камісіі культуры. „Часопіса", які друкуе і па-польску, яна не чытае таксама. „Przegląd Prawosławny" — так, бо клубавы калега, ягоны галоўны рэдактар дэпутат Яўген Чыквін, яго ёй *podrzuca*. Інфармацыі аб беларусах дэпутатка мае з *wyczulenia dziennikarskiego*, і атрымлівае, як кажа, з крыніц, значыць, хоць бы з кантактаў з выбаршчыкамі ў сваім бюро ў Нараўцы, ад калег з меншасных праграм беластоцкіх радыё і тэлебачання.

Дэпутат ад СЛД Аляксандр Чуж, як адзіны з парламентарыяў, прызнаецца, што чытае беларускі друк — зрэдчас „Ніву" (атрымлівае прыватнымі шляхамі).

— Што мяне ў апошні час зацікавіла, цяжка ў гэты момант сказаць. Шмат ведаю аб праблемах нашых беларусаў з сустрэч з Янам Сычэўскім, — дадае Чуж.

[працяг ☞ 2]

Бі-бі-сі. Беларуска-беластоцкі слоўнік ☞ 2

Міхась АНДРАСЮК

У гастранамічным нашым слоўніку Амерыка назаўжды замацавалася словам „амерыканка". Гэты класічны варыянт бульбіны бездыскусійна апярэджвае ўсякую іргу, бронку, ірыса. І калі б не той назойлівы каларадскі жук (адкуль ён у нас — добра вядома старэйшаму пакаленню), можна было б без сумненняў сказаць: „смачна есці".

Заслона, якая замацоўваецца ☞ 2

Яўген МІРАНОВІЧ

У гэтым годзе былі ўведзены візы. У польскай прэсе, па радыё і тэлебачанні можна не раз пачуць ад палітыкаў і прадстаўнікоў дзяржаўных служб, што рух на мяжы ў параўнанні з мінулым годам зусім не паменшыўся. Але дастаткова пайсці на любы беластоцкі базар, каб пераканацца, што...

O! Środek Kultury Białoruskiej! ☞ 4

Наталля ГЕРАСІМЮК

Ну, Музей — гэта зразумела: экспанаты, доследы, навуковая праца, выстаўкі, экспазіцыі і г.д. А што ж з асяродкам? Якім ён павінен быць? Чым ён можа прыцягнуць і аб'яднаць беларусаў і не толькі?..

Называлі яго „дзядзька" ☞ 8

Ада ЧАЧУГА

Да Бельскага беларускага ліцэя бацька быў прывязаны як мала хто, кажа спадарыня Тамара. Аж да пенсіі даязджаў на працу з Беластока, куды бацькі пераехалі ў 1958 годзе, каб быць разам з дочкамі. Пакахаў Беларусь як нешта самае блізкае...

Затопленыя антарктыды Ірэны Стэльмах ☞ 9

Міра ЛУКША

Маё вялікае шчасце, што я нарадзілася на Падляшшы. Трэба гэта толькі ўмець выкарыстаць. Гэтае месца дае вельмі шмат творчых сокаў...

Дзяцінства заварожанае хвалямі ☞ 8-9

Анатоль МАЎЧУН

Пасля нейкіх дваццаці гадоў ад таго часу, як з волі капрызнага лёсу прыйшлося мне развітацца з Глыбоччынай, ізноў здарылася мне нагода вандраваць дарогамі, якія М. Танк назваў „закалыханымі жытам"...

Бі-бі-сі. Беларуска-беластоцкі слоўнік

А — Амерыка

Амерыка — частка свету, якую складаюць Амерыка Паўночная і Амерыка Паўднёвая. Аднак гэтая Паўднёвая Амерыка, па вельмі розных прычынах — эканамічных, палітычных, гістарычных — магла б з нашага беластоцка-беларускага пункту гледжання быць, а калі б і не было яе — таксама добра.

Як першы прычаліў да амерыканскіх берагоў — афіцыйна — Хрыстафор Калумб у 1492 годзе, неафіцыйна — у якасці вікінгаў — былі там нашы еўрапейскія продкі нашмат раней.

У беларуска-беластоцкім асяроддзі, з афіцыйнага (згоднага дзяржаўнаму) пункту гледжання — Паўночная Амерыка наш лепшы сябра. Без залішняй рызыкі скажу — самы лепшы. З хвіліны, калі левыя (таму і косць ад косці нашы яны) міністры-прэзідэнты, ступаючы амерыканскім следам у Ірак, апярэдзілі на крокаў як мінімум тры ўсіх еўрапейскіх суседзяў, не можа быць іначай.

Куды больш складанае становішча неафіцыйнае. Удакладняецца яно перш за ўсё ў прыватных дыскусіях, на скупцы малака, на аўтобусным паўстанку, пры нагодзе сямейных вясельна-хрысцінных, а — бывае такое часцей — і сумна-хаўрусных застолляў. Станоўчая ацэнка іракцкай бойні сучасным беластоцкім беларусам далёкая і чужая не менш, як іхнім дзедам-прадзедам чужой і далёкай была ў свой час калгасатворчая ідэя расійскага камунізму. Уцякалі ад яе — хто куды — на другі бок дзяржаўнай мяжы, а нават на супрацьлеглы бераг акіяна.

Але — дзякуй Богу і законам фізікі — усё ў свеце *pantha rei*. І зараз — згодна з прынцыпам „хто вораг Расіі, той усяму свету вораг" — дарма шукаць Амерыку ў прыватным спіску нашых сяброў.

На нашу думку, Амерыка кругласутачна абмяркоўвае таксама якім чынам уварвацца ў незалежную Беларусь ды вылузаць яе з зоны расійскіх уплываў. Нат калі зацікаўленне амерыканскай імперыі Беларуссю і скарацілася да нябачнага вокам нуля, успрымаецца гэта як хітра разгорнутая цішыня, якая праз дзень — месяц — год аб'явіцца вялікім бураломам. Гэтае якраз меркаванне адбываецца па прынцыпе „як ваўка не кармі, і так на лес глядзець будзе".

Калі б тая Амерыка здагадалася, што думаем аб ёй мы, беластоцкія беларусы, ад сораму насупонілася б і пачырванела б да памераў самага вялікага ў свеце сцяга пралетарскай рэвалюцыі.

Паралельна з непрыхільнымі меркаваннямі (характэрнымі групе), ёсць у нас таксама другі неафіцыйны, затое поўнасцю ўжо прыватны погляд на Амерыку. Як не дзіўна, у ніякім выпадку не згаджаецца ён з поглядам першым.

Справа ў тым, што ці не кожны беластоцкі беларус мае вялікае асабістае жаданне — усё ж такі вока ў вока стрэцца з гэтым міфічным ворагам, сама лепш на ягонай тэрыторыі, у Нью-Йорку, Чыкага або Сан-Францыска. І спадзяванне такое — можна сказаць — перарадаецца з пакалення ў пакаленне. Калі не пашанцавала бацькам, ёсць жаданне адтэрмінаваць паездку на сыноў або ўнукаў. На біржы пакаленнева-сямейных дасягненняў козыр „мой сын у Амерыцы сядзіць" ацэньваецца куды вышэй за празаічнае „а мой дохтарам у Беластоку працуе". А калі можаш працягнуць торг і дадаць: „праўдападобна назаўсёды ў гэтай Амерыцы астанецца", маўляў не козыр ужо ў тваіх руках, а ўсемагутны джокер.

Такая градацыя вартасцей якраз не патрабуе дадатковых доказаў, бо магчымая (лёс бывае непрадбачлівы) рээміграцыя з насалоджанай мроямі сталіцы ваяводства ў бацькоўскую хату здараецца наогул у рэзультаце жыццёвага банкруцтва. А вось вяртанне ў Беласток з Амерыкі ўспрымаецца як уласцівая вялікаму панству фанабэрыя (не зусім яна нам зразумелая, але ў добрай цане, нешта як мастацтва Лёніка Тарасэвіча), або таксама ж — як доказ неабмежаванай хітрасці. Паясняецца гэта зусім нескладана — з'ехаў, каб вярнуцца туды ў больш спрыяльны момант. Хітрасць у нас таксама ў добрай цане, бо дазваляе яна прыстасавацца ды выжыць у кожных умовах і за кожнай уладай (тут нашы асацыяцыі ідуць у напрамку В. Цімашэвіча — называе хай сябе кім толькі захоча, мы і так ведаем хто ён).

Так вось неафіцыйнае жаданне злётаць „за калюжу" не чужое нам. Прытым — сама лепш — злётаць афіцыйна, з падтрымкай зялёнай карты. Дае яна рэальны шанц адбіцца на век вечны ад нэндзы, якая ў сваю чаргу спакон вякоў (а напэўна ад першага выстралу „Аўроры"), асацыюецца з Расіяй.

Але ў Расію беластоцкі беларус наогул не збіраецца. Хіба што неафіцыйна — за цыгарэткамі і спіртным у Гародню або Бярэсце.

Ды якая ж там зараз Расія?

Слова *амерыка*, акрамя геаграфічнага значэння, выпаўняла раней таксама і іншыя функцыі, а менавіта называла стан душы. Прыклад. Аддыхаючы на якой дзяржаўнай фабрыцы або будове ад прыватнай бацькоўскай гаспадаркі, а прытым нязначна падласаваўшыся півам, на пытанне „што чуваць?", чалавек разводзіў рукамі, пацягаўся раскошна і, прыжмурыўшы вочы да летняга сонейка, адказваў: *амерыка*. На жаль, з гэтай якраз амерыкі вытурыў нас капіталізм.

У гастранамічным нашым слоўніку Амерыка назаўжды замацавалася словам „амерыканка". Гэты класічны варыянт бульбіны бездыскусійна апярэджвае ўсякую *іргу, бронку, ірыса*.

І калі б не той назойлівы каларадскі жук (адкуль ён у нас — добра вядома старэйшаму пакаленню), можна было б без сумненняў сказаць: „смачна есці".

Міхась Андрасюк

Заслона, якая замацоўваецца

У час халоднай вайны мяжу паміж савецкай і амерыканскай зонамі ўплываў у Еўропе называлі жалезнай заслонай. Перасячэнне гэтай мяжы патрабавала шмат захадаў, афармлення дзесяткаў дакументаў, доўгага чакання на рашэнні чэкістаў. Невялікі працэнт жадаючых мог атрымаць дазвол на праезд на другі бок жалезнай заслоны. Ва ўнутры савецкага лагера рух людзей паміж „народнымі рэспублікамі" быў не менш складаны. Паездка з Беластока ў Гродна патрабавала шматмесячных намаганняў, але праўдападабенства атрымання дазволу на выезд на Усход было значна большае чым на захад.

Нас няма і іх няма

На пачатку 1990-х гадоў хваля свабоды разбурыла большасць заслонаў. Каб выехаць з Польшчы на Захад трэба было мець толькі пашпарт і грошы на білет. Падарожжа на Усход патрабавала яшчэ запрашэння або ваўчэра, але гэтыя перашкоды можна было абмінуць, выдаткоўваючы некалькі долараў. Больш прыкрыя для людзей перасякаючых, напрыклад, беларуска-польскую мяжу былі адносіны да іх пагранічных і мытных службаў. Дэманстрацыя хамства з боку дзяржаўных функцыянераў на абодвух баках мяжы пакідала не найлепшыя ўражанні і не заахвочвала да чарговага падарожжа ў гэтым напрамку.

У гэтым годзе былі ўведзены візы. У польскай прэсе, па радыё і тэлебачанні можна не раз пачуць ад палітыкаў і прадстаўнікоў дзяржаўных служб, што рух на мяжы ў параўнанні з мінулым годам зусім не паменшыўся. Але дастаткова пайсці на любы беластоцкі базар, каб пераканацца, што на ўсходняй мяжы нанава ўзнікла заслона. Яна можа яшчэ не жалезная, але з моцнага сталёвага і калючага дроту. Праўда, можна прайсці цераз гэтую заслону, аднак штораз менш ахвотных перажываць такія прыгоды, як афармленне візаў. Шмат вучоных, якія раней прысутнічалі ў шматлікіх навуковых сустрэчах, маючы перспектыву затраты некалькіх дзён часу, усё часцей адмаўляецца ад выездаў. Купцы на беластоцкіх базарах закрываюць свае малыя бізнесы. З гэтага, што купяць палякі, заплаціўшы ўсе падаткі, няшмат астаецца, — чуецца пастаяннае нараканне прадаўцоў з найбольшага базара па вуліцы Кавалерыйскай. Рускія, — гавораць яны, — раней куплялі амаль дзевяноста працэнтаў усяго тавару. Цяпер іх амаль тут няма.

Памірае надзея!

Вакол Баранавіцкай шашы, якая вядзе з Беластока ў напрамку Баброўнікаў і далей да мяжы, пабудавалі ў апошніх гадах шмат оптавых магазінаў. Здалёк віднеюць рэкламныя стэнды на рускай мове. Яшчэ восенню большасць фірмаў вяла гаспадарчую дзейнасць, сёння закрытыя там брамы, вокны і дзверы. Пакуль не адвязуць тавару на плошчы, каля магазінаў, за дня маёмасць найчасцей пільнуе сабака, вечарам, магчыма, дапамагае яму яшчэ і вахцёр, але ахоўнікі знаходзяцца толькі да часу, пакуль уласнік не адвязе тавар у іншае месца. На ўсходняй перыферыі Беластока найлепш відаць, як памірае надзея на выратаванне нашай правінцыі з эканамічнага заняпаду шляхам гандлю з суседняй Беларуссю ці Расіяй.

Прапаганда ў апошнія гады рабіла спадзяванні, што выратаванне гаспадаркі прыйдзе з Захаду. Раней усе спадзяванні на беспраблемнае жыццё былі звязаны з дэмакратыяй і рынкавай гаспадаркай. Ніхто не падказаў беднай шляхце, што дабрабыт трэба яшчэ выпрацаваць. Багацця назапашанага камуністамі хапіла толькі на некалькі гадоў і для невялікага адсотка прафесійных дэмакратаў, хрысціян і фарбаваных сацыялістаў. Шляхта жыве цяпер новай надзеяй на еўрасаюзныя датацыі. Пэўнае толькі тое, што просты люд, званы часам электаратам, неўзабаве чакаюць новыя расчараванні.

Яўген Мірановіч

Часціну Каложы прывезлі з сабой

27 студзеня ў галоўнай выставачнай пляцоўцы Беларусі — Нацыянальным палацы мастацтваў — адкрылася выстава „Сучаснае мастацтва Гродзеншчыны".

Падобнай грандыёзнай акцыі ў Мінску гродзенскія майстры пэндзля і алоўка не праводзілі з 1996 года. Па словах старшыні абласной суполкі Саюза беларускіх мастакоў акадэміка скульптуры Уладзіміра Панцялеева, кожны аўтар прадставіў на экспазіцыі ад шасці да дзесяці сваіх прац. Прысутнічаюць усе жанры: жывапіс, графіка, скульптура, дэкаратыўна-ўжытковае мастацтва. Сімвалам выставы гродзенцаў у сталіцы можна лічыць вялікае палатно з выявай часткі сцяны Каложскай царквы.

— Не я і не мае сябры — Віка Загнетава і Саша Сільвановіч — аўтары гэтага твора, хаця і дапамагалі ў ягоным паўстанні, — гаворыць акадэмік жывапісу Сяргей Грыневіч. — Аўтар той, хто збудаваў Каложу. І вось у Гродне ёсць гэты цуд, а ў Мінску няма. Таму мы і прывезлі часціну Каложы з сабой...

Акрамя гродзенцаў у Нацыянальным палацы мастацтваў выставілі свае працы прафесійныя творцы з Ваўкавыска, Ліды, Навагрудка і Бярозаўкі. Экспазіцыю ў Мінску можна будзе паглядзець да дзевятага лютага.

Вацлаў Галімскі

Толькі скнара і лянівы не выпісвае „Нівы"

Ашчаднасць на беларусах?

[1 ☞ працяг]

У сваю чаргу падляшскі сенатар Права і справядлівасці, былы дэпутат Паразумення цэнтрум і прэзідэнт Беластока Кшыштаф Юргель прызнаецца адкрыта:

— Не чытаю. Тое, што мяне цікавіць, значыць, аб польска-беларускіх гаспадарчых адносінах, маю з Міністэрства замежных спраў. Яўген Чыквін дае майму клубному калегу Мар'яну Пілку „Przegląd Prawosławny". Я тады той часопіс лістаю, бо цяжка сказаць, што чытаю яго.

І, на канец — старшыня Сеймавай камісіі нацыянальных і этнічных меншасцей Генавефа Вісьнёўская, падляшская дэпутатка ад „Самаабароны":

— Наш сакратарыят не мае беларускай прэсы. Ёсць ромская, літоўская, жыдоўская, славацкая... Яўген Чыквін прывозіць нам „Przegląd Prawosławny". Іншыя меншасныя асяроддзі нам прысылаюць. Аб праблемах беларускай меншасці ведаю ад дэпутатаў з рэгіёна. Няма ў нас звычаю падпісвацца на прэсу.

— Не магу адказаць за прэзідыум камісіі, чаму так ёсць. Большасць, калі б і падпісвалася ці атрымлівала іншым шляхам прэсу на мове меншасцей, напрыклад, па-беларуску, мела б праблему: не ведае мовы, — прабаваў тлумачыць дэпутат Яўген Чыквін з Сеймавай камісіі па справах меншасцей.

Мацей Халадоўскі

Сёння цяжка зразумець касцельна-польскі патрыятызм Радзевічуўны ў спалучэнні з антысемітызмам і ігнараваннем нацыянальных меншасцей...

Яна пісала пра нашу прыроду...

— Я нічога гідкага ім не зрабіў — і яны, пані гэта, мне не зрабілі! — заяўляе на ўступе Павел Іванавіч Матвейчык. Але праз момант раскажа пра гідкі эпізод, які здарыўся тут перад уцёкамі Марыі Радзевічуўны.

— Ужо тыя сабакі без зубоў, — кажа пра віноўнікаў-бальшавікоў, якія зняважылі пісьменніцу. Дзядзька раскажа, каб мы там у Польшчы ведалі праўду. Каб не глядзелі на іх як падлюгаў, без *совесці* і сэрца.

З-пад тоўстых акуляраў дзеда Паўла капаюць слёзы, дзесяць метраў далей, пад магазінам, загараюць маладзёны, пераклікаюцца па-палеску цёткі...

усё па кустах ходзяць, шукаюць

У Грушава, да двара Марыі Радзевічуўны пад Кобрынам прыязджаюць турысты з Польшчы і наша тут прысутнасць не новасць і не сенсацыя. Сенсацыя ў іншым — чаму размаўляем па-беларуску?

— Нядаўна, — кажуць у магазіне, — тры аўтобусы прыгналіся. Вылезуць з аўтобуса і ўсё па кустах ходзяць, чагосьці шукаюць. Або пад дубам „Дэвайцісам" шчоўкаюць фотачкі.

— Пакупайце гарэлачку, — заахвочвае прадаўшчыца, — харошая она, беларуская.

Марыю Радзевічуўну ведаюць і ўспамінаюць з пашанай.

— Она была пані, памешчыца, — усміхаецца як сонца залатазубая маладзіца. — Она была пісьменніца, она пісала про нашу аколіцу, про нашу прыроду і обрады.

Калі цётка прадэкламавала сваю фразу, дадала — сама я прыезджая... Смяемся. Дзе, як не ў месцах прасякнутых творчым духам, шукаць крылатых недарэчнасцяў?

Магазін, адкуль мясцовыя жыва назіраць і каменціруюць выгляд і паводзіны польскіх турыстаў, працуе ў ацалелым фрагменце палаца.

— Двор спалілі... — Павел Матвейчык, як сведка здарэнняў, ведае найлепш. — Партызаны спалілі, каб немец не ўзяў.

Ужо пасля вайны, у 1947 годзе, адрамантавалі ацалелыя фрагменты будынкаў, спачатку наладзілі рамонтную базу, пасля школу, магазін і сталовую.

— І гэта ўсё што асталося?

— Усё! — дзед памятае той шыкоўны даваенны двор з калонамі, але замест каменціраваць, махае рукой.

— Калі яно было...

нібыта ў пошуках зброі

Бо калі прыйшлі 22 верасня 1939 г. у Грушава бальшавікі, запанавала пекла. Як успамінае гэты судны час прыяцелька пісьменніцы, Ядвіга Скірмунт, у наваколлі ўспыхнула хваля забойстваў. Згінуў грушаўскі ляснік, войт, памешчыкі з сынамі з суседняга двара. Успаміны Ядвігі Скірмунт прасякнуты болем і расчараваннем да мясцовых „русінаў".

— І тыя добрыя сяляне, якім Марыя заўсёды прыходзіла з дапамогай, — піша, — заахвочаныя бальшавікамі стварылі камітэт і перанялі на ўласнасць маёнтак. Находзілі дзень у дзень, дамагаліся зброі, зневажалі, палохалі расстрэлам. Калі Марыя ляжала хворай, — адзначае прыяцелька, — у двор прыбілася зграя мясцовай моладзі нібыта ў пошуках зброі. Пасля кароткіх пошукаў пачаўся рабунак. Выносілі бялізну, адзенне, пасцель, мэблю. Выташчылі піяніна. Нам загадалі перайсці ў два невялікія пакойчыкі, а самі адкрылі падвалы, дзе перахоўваўся спірт і пілі дазарэу за поўнач.

Праследы і рабунак аўтарка ўспамінаў бачыць як помсту за каталіцка-польскую дзейнасць, якую вяла пісьменніца ў жыцці і творчасці.

— А дзе табе сумленны чалавек пойдзе рабаваць і мардаваць? — хвалюецца Павел Матвейчык. — Тыя, — кажа пра бальшавікоў, — найгоршых бандытаў падмовілі... А яны ва ўсім свеце *адзінакавы!*

Праект ГК/ГХ/ВХ/МП

Ганна Кандрацюк, Вячаслаў Харужы, Гражына Харытанюк

* * *

— Калі ласка, заходзьце! — запрашае дырэктар Ніна Марчук. У школе краязнаўчы музейчык. Над дзвярыма насцен-газета, прысвечаная Марыі Радзевічуўне. Даваенныя артыкулы на польскай мове, фатаграфіі ў клімаце „Polesia czar". На чорна-белай фатаграфіі грушаўская пані з мужыкамі. Радзевічуўна ў доўгім жупане-сурдуце хутчэй напамінае добрага бацечку, як матрону-памешчыцу. Здымак жыва пераклікаецца з літаратурнымі сюжэтамі і персанажамі пісьменніцы. Ззяе вернападданнасцю і ідыліяй у стылі — добрая пані і яе дзеці-мужыкі, дарэчы, у тым жа чароўным палескім стылі — з доўгімі белымі бародамі, у белых світках і лыкавых лапцях, з люлькамі ў зубах.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

— Мы современных авторов читаем...

— Усе матэрыялы мы атрымалі з Польшчы ад сяброў-паклоннікаў Радзевічуўны, — кажа Ніна Марчук.

Маладыя, як дырэктар Марчук, не памятаюць брутальных эпізодаў з 1939 года. Асоба Марыі Радзевічуўны паказана са шчырай сімпатыяй. Тактоўна і павярхоўна, з рэгіянальнай перспектывы. Без ніякіх уваг, каментарыяў.

— Не хапае нам крыніц на беларускай мове, — кажа настаўніца: — А хто тут ведае польскую?

У Грушаве беларуская школа з паўсотняй навучэнцаў і адзінаццаццю настаўнікамі.

ангажавалася ў польскасць

— Можа і добра, што не ведаюць усёй праўды пра Марыю Радзевічуўну, — думаю ў тым жа музейчыку, — сёння цяжка зразумець яе касцельна-польскі патрыятызм у спалучэнні з антысемітызмам і ігнараваннем нацыянальных меншасцей.

Светапогляд аўтаркі „Дэвайціса" не ёсць аргінальны ў часе і месцы (жыла ў 1864-1944 гг.), і з сённяшняга пункту гледжання можна ўспрымаць як адрэагаванне болю і прыніжэння пасля трох раздзелаў Рэчы Паспалітай.

Нарадзілася яна ў самы трагічны для сям'і час — 1864 год. Бацька, у час Студзеньскага паўстання перахоўваў зброю паўстанцаў, за што быў сасланы ў Табольскую губерню, а маёнтак Пянюга пад Ружанамі канфіскаваны. Пасля нараджэння дачкі, у ссылку, услед бацьку, дабравольна падалася маці Амалія. Марыю найперш выхоўвала бабуля, пасля манашкі-непакалянкі. Пасля ў 1933 г., стараннем Радзевічуўны, у недалёкім Гарадцу паселяцца манашкі-ўршулянкі, заснуюць манастыр, каб весці прапольскую місію ў Кобрынскім, Пінскім і Драгічынскім паветах.

Сама пісьменніца моцна ангажавалася ў пашыранне на Палессі польскасці. Арганізавала тайнае навучанне ў шляхецкіх засценках і вёсках, распаўсюджвала польскую літаратуру, дзейнічала ў Звязе памешчыкаў. Лічыла, што польскія ўлады какетнічаюць у адносінах да нацыянальных меншасцей.

Хоць Марыя Радзевічуўна трымае каланіяльную лінію, яе род выводзіцца з Піншчыны. Яе братанкам з'яўляецца беларускі палітычны дзеяч Леапольд Родзевіч, а Раман Скірмунт, сутваральнік БНР і беларускі дзеяч, дарэчы, брутальна забіты тымі ж бандытамі-„русінамі" ў 1939 годзе — сваяк пісьменніцы.

дзе шуміць святы „Дэвайціс"

Аляксандр і Сярожа загараюць на лавачцы перад магазінам і для ахалоды любуюцца піўцом. Яны студэнты, адзін вывучае меліярацыю, другі — будаўніцтва ў Брэсце. Не хочуць размаўляць ні на літаратурнай мове, ні па-мясцоваму — цвёрдым палескім дыялектам (як у нас, пад Чаромхай), хоць раней хадзілі ў беларускую школу.

— А ці чыталі Радзевічуўну?

— Я больш современных авторов читаю, — кажа дыпламатычна Аляксандр.

Марыя Радзевічуўна напісала ў Грушаве за сорак раманаў і навелаў. Хоць крытыка называла іх „romansidłami według oklepanych schematów", папулярнасць і слава асталіся ў Польшчы па сённяшні дзень.

За будынкам былога двара расце дуб „Дэвайціс", ахрысціла яго сама пісьменніца. Побач памятная дошка ў яе гонар на польскай і беларускай мовах.

Віктар Прымачук, экс-дырэктар школы і настаўнік гісторыі, прапануе наведаць могілкі, дзе пахаваныя бацькі і сястра пісьменніцы. На абгароджаным жалезным плотам цокалі, выгарэлыя надмагільныя лямпачкі.

— Парадак наводзяць нашы вучні, — з гонарам заяўляе дырэктар.

Марыя Радзевічуўна была рамантыкам і пазітывісткай у жыцці і ў творчасці. Пры двары заснавала бібліятэку, прадшколле, прытулак для бедных. Дзейнічала і прапагандавала сельскагаспадарчае кола „Мозул". Пяцьдзесят тры гады самотна гаспадарыла на 1 600 гектарах, прытым маёнтак Грушава за яе часоў перажыў найбольшы росквіт.

распранулі праверыць...

У школьным музейчыку таксама этнаграфічны куточак. Пані Ніна Марчук даваляе нам пераадзецца ў народныя касцюмы. Разам з сябрамі, следам турыстаў, бяжым пад „Дэвайціса" нашчоўкаць здымак.

— Ой! — хвалюецца сябра-гісторык Вячаслаў, — забыўсо скінуць гадзіннік!

Я ў сваю чаргу, быццам і не скінула ўбору з музея, якраз у Грушаве мне падарылі палескі аўтэнтычны касцюм. Зараз, калі налятае ахвота спяваць, апранаю сукенку. Ёсць адна праблема — у Беластоку „Polesia czar" дзейнічае ў адваротны бок і за мае беларускія песні ў кафэ-бары „Стайня" я ледзь не дастала ў морду.

* * *

Марыя Радзевічуўна з'ехала ў Польшчу 7 кастрычніка 1939 года. Памерла пасля пяці гадоў туляння напрыканцы вайны на васьмідзесятым годзе жыцця. Яе магіла знаходзіцца на варшаўскіх Павонзках.

— Як вывозілі нашу памешчыцу, — расказвае сцішаным голасам Павел Матвейчык, — тыя падлюгі зняважылі яе. Бо яна, пані гэта, як мужчына апраналася. — І тыя, бандзіты распранулі яе праверыць: хто яна — дзяўчына ці хлопец?

Пасля, як расказвалі ў вёсцы — ніхто не смяяўся.

Ганна КАНДРАЦЮК

Крыніцы: Паводле успамінаў Я. Скірмунтовай *Pani na Hruszowej. Dwadzieścia pięć lat wspomnień o Marii Rodziewiczównie*.

O! Środek Kultury Białoruskiej!

Ужо, напэўна, усе ведаюць, што арганізацыя, якая мела доўгую і нудную назву, і не менш доўгую і складаную гісторыю, а менавіта Грамадскі камітэт пабудовы Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы (ГКПМіАБК), перастала існаваць. Шматгадовая пабудова („даўгабуд") нарэшце скончылася. Настала пара „ўдыхнуць жыццё" ў велізарны будынак пад гучнай назвай Музей і асяродак беларускай культуры.

Ну, Музей — гэта зразумела: экспанаты, доследы, навуковая праца, выстаўкі, экспазіцыі і г.д. А што ж з асяродкам? Якім ён павінен быць? Чым ён можа прыцягнуць і аб'яднаць беларусаў і не толькі? Гэтую праблему вырашаць нам, беларусам, і не абраным асобам, а ўсім разам, што называецца талакою.

Зразумела, што без большых праблемаў можна зрабіць Дом культуры. Няхай і беларускі, але гэта будзе толькі яшчэ адзін Дом культуры, якіх усюды пруд прудзі. Ды толькі людзі шмат гадоў чакалі не чарговага тыпавага Дома культуры, а чагосьці лепшага, цікавейшага, чаго больш нідзе ні ў каго няма.

Першапачатковая задума была такой — пабудаваць „ДОМ УСІХ БЕЛАРУСАЎ". І каб быў ён адзіны і непаўторны, каб як у сваёй хаце сябе адчувалі і старыя, і малыя. Каб маглі ў ім знайсці сабе занятак па душы ўсе: і найвышэйшага палёту інтэлектуалы, і найпрасцейшыя звычайныя. І каб гэта быў не проста так сабе „Асяродак", а каб нават па-польску гучала з годнасцю, здзіўленнем і захапленнем: „O! Środek Kultury Białoruskiej!!!"

Вось і настаў час усім вырашаць якім быць гэтаму „ДОМУ". Таму і кірую два пытанні да ўсіх беларусаў, да ўсіх беларускіх суполак і арганізацый, да ўсіх каму неабыякавы лёс беларускай культуры і лёс Асяродка:

1. Якім вы бачыце Асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы?

2. Як вы бачыце сябе ў Асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы?

Запрашаем усіх да супрацоўніцтва. Будзем удзячны за кожную параду, падказку, падтрымку.

Наталля Герасімюк

Наш адрас: 17-200 Hajnówka, ul. 3 Maja 42, Ośrodek Kultury Białoruskiej, e-mail: asiarodak@op.pl

У Чаромсе паступае адно адзін экземпляр, а з календаром прадаўшчыца заказвае дзве-тры сотні...

У ніўскай сям'і ад 40 гадоў

Штуршком для гэтага допісу была публікацыя Мікалая Лук'янюка „Сябры-карэспандэнты", якая друкавалася ў 3 нумары „Нівы" ад 18 студзеня. Аўтар успамінае мінулае, калі ў тыднёвіку быў аб'яўлены конкурс на карэспандэнта года і спаборніцтва за званне найлепшага.

Маё супрацоўніцтва з „Нівай" працягваецца больш за сорак гадоў. За два гады тыднёвік будзе адзначаць пяцідзесяцігоддзе. Можна сказаць, што гэта і мой юбілей. Дзякуючы „Ніве" навучыўся я роднай мове (у школе не вывучаў). Зараз карыстаюся ёю ды не саромеюся. Лічу сябе беларусам і цвёрда буду стаяць пры гэтым. Так ці інакш ніўскую сям'ю трэба адбудаваць. А ёсць магчымасць. Прыклад з тыражом. Навагодні нумар разыходзіцца вокамгненна. У Чаромсе, напрыклад, у кіёск на пероне паступае адно адзін экземпляр, а з календаром прадаўшчыца заказвае дзве-тры сотні. Таксама справа маецца ў іншых пунктах ды мясцовасцях. Праўда, своеасаблівасцю тут беларускі каляндар з царкоўнымі святамі. Але ці толькі? „«Ніва» задарагая", — гаварыла знаёмая. „Замнога палітыкі", — канстатавалі іншыя. У сапраўднасці, такія асобы не цікавіліся газетай і не чыталі яе ўвогуле. З майго пункту гледжання, чытачоў трэба шукаць (у асноўным) у беларускіх асяроддзях Гайнаўшчыны, Бельшчыны ды ў Беластоцкім і Сямятыцкім паветах, хоць не толькі. Журналістам, як і карэспандэнтам, трэба заглядаць у самыя адлеглыя куточкі, дзе пражываюць беларусы. Успамінаюцца мне шасцідзесятыя гады, калі ніўская сям'я лічыла некалькі дзесяткаў супрацоўнікаў. Пісалі земляробы, настаўнікі, працаўнікі дзяржаўных устаноў ды школьнікі. Як тады чыталі „Ніву"? Пэўна, скажаце, даражэнькія, што многае перамянілася. Праўда гэта. А колькі зараз лічыць кола супрацоўнікаў? На пальцах дзвюх рук можна пералічыць. Таму далучаюся да закліку Міколы Лук'янюка: пішыце сябры ў „Ніву", старыкі-ветэраны і вы, маладое пакаленне. З таго, што мне вядома, неўзабаве сустрэнемся на з'ездзе карэспандэнтаў. Лічу, што спаткаемся з даўнімі знаёмымі: В. Петручуком, П. Байко, М. Панфілюком, Г. Марозам, М. Куптэлем, ды многімі іншымі. Да хуткай сустрэчы.

Уладзімір Сідарук

У час калядных сустрэч выступілі 23 калектывы, у якіх спявалі каля 450 асоб

Мілае калядаванне

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Група Прадшколля н-р 5

У першы дзень Новага года (паводле юліянскага календара) у Гайнаўскім доме культуры спаткаліся маладыя праваслаўныя каляднікі з Гайнаўшчыны. Арганізатары мерапрыемства, якімі былі Дэканальны інстытут праваслаўнай культуры ў Гайнаўцы, Гайнаўскае аддзяленне Праваслаўнага брацтва св.св. Кірылы і Мяфодзія, ГДК і Гайнаўскі аддзел БГКТ захавалі гайнаўскую традыцыю, якая прадбачвае, што побач вучняў падставовых, гімназічных і сярэдніх школ калядуюць дашкольнікі. Ініцыятарамі калядавання дзяцей і моладзі на сцэне, якое арганізавалася з 1998 па 2002 год у Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, былі Яўген Сачко — дырэктар гэтай школы і Міхал Голуб — старшыня Гайнаўскага аддзела БГКТ. Спачатку ў калядаванні прымалі ўдзел дзеткі і моладзь з Гайнаўкі. Пасля пачалі далучацца вучні з іншых мясцовасцей. Калядоўшчыкі, якіх вылучыла конкурсная камісія, выступалі пасля на святочным канцэрце ў ГДК. З 2003 года Гайнаўскія сустрэчы з праваслаўнай калядкай праводзяцца непасрэдна ў Доме культуры.

— Калядныя сустрэчы памагаюць засвоіць праваслаўныя традыцыі, якія захаваліся ў нашай культуры. У час такіх спатканняў мы перажываем свята Нараджэння Хрыстовага на падабенства ўсходніх мудрацоў. Дзеці на Гайнаўшчыне ахвотна вучацца калядак. Цешыць, што ў сустрэчах прымае ўдзел штораз больш калектываў з-па-за Гайнаўкі, — сказаў дырэктар Дэканальнага інстытута праваслаўнай культуры ў Гайнаўцы протаіерэй Славамір Хвойка, які адкрыў мерапрыемства. Прывітаў ён ганаровых гасцей, сярод якіх былі настаяцель Свята-Троіцкага прыхода ў Гайнаўцы мітрафорны протаіерэй Міхаіл Негярэвіч, намеснік гайнаўскага старосты Ежы Сірак і намеснік бурмістра Гайнаўкі Міраслаў Мордань.

Калядаванне пачалося ад вучняў падставовых школ і дашкольнікаў. Наймалодшыя адважна вялі сябе на сцэне. Яны віталіся і развітваліся з публікай вясковымі прымаўкамі. Бацькі апранулі іх у рознакаляровую вопратку і падрыхтавалі ім вялікую прыгожую гвязду. Усіх дзетак з прадшколляў н-р 1, 2, 3 і 5 рыхтавала настаўніца Божага закону Валянціна Радзымін. Наймалодшым моцна апладзіравалі сямейнікі, якія фатаграфавалі і фільмавалі сваіх дзетак.

— Калядаванне ў Доме культуры з'яўляецца вельмі мілым мерапрыемствам. Удзельнічае ў ім многа дзетак, што дае шмат аптымізму і радасці, — заявіў старшыня конкурснай камісіі протаіерэй Іаан Раманчук. — Традыцыйнае калядаванне было ў нас з гвяздай, але без музычных інструментаў. Дзеткі і моладзь адыходзяць ад гэтых прынцыпаў. Ацэньваючы вучняў, мы звяртаем увагу не толькі на прыгажосць спеву. Важнымі з'яўляюцца таксама гвязда і музычныя інструменты, якімі сёння былі акардэон, гітара і бубны.

Да выступленняў на сцэне найчасцей рыхтавалі вучняў настаўнікі Божага закону і музыкі. Яны таксама былі дырыжорамі ў час агляду. У час калядных сустрэч выступілі 23 калектывы, у якіх спявалі каля 450 асоб. Усіх каляднікаў пасля выступленняў вітаў Дзед Мароз і ўручаў падарункі.

Аляксей Мароз

У Бельскім павеце каля тысячы коней

Конскі пашпарт

Да 31 снежня 2004 года ўсе коні, якія выходзяць за межы сваёй гаспадаркі, павінны быць забяспечаны пашпартам. Патрабуе гэтага закон аб прафілактыцы заразных хвароб жывёл, ветэрынарным даследаванні забойных жывёл і мяса ды ветэрынарнай інспекцыі ад 14 лютага 2003 года. Увод гэтага дакумента прадыктаваны быў заклапочанасцю здароўем людзей і жывёл.

Конскі пашпарт з'яўляецца 24-старонкавай кніжачкай, у якой змешчаны весткі пра чарговых уласнікаў каня, яго ідэнтыфікацыйны нумар і паходжанне. Ёсць там таксама інфармацыі пра здароўе жывёлы, яго ветэрынарныя агляды, вакцынацыі ды заключэнне ўласніка каня пра яго назначэнне пасля бойні — ці можна спажываць яго мяса, бо жывёла можа быць лечана сродкамі, якіх рэшткі ў мясе шкодныя людзям.

Коней ідэнтыфікуе і забяспечвае пашпартамі з 1 ліпеня 2003 года Польскі саюз каняводаў. Разлічваюцца наступныя расы: малапольская, вялікапольская, паўшляхетная шлёнская, халоднакроўная, гуцульская, тарпаны ды коні запісаныя ў рэестр поні і малых коней („цыркавых"). Коні без паходжання таксама будуць ідэнтыфікаваны і атрымаюць пашпарты.

Каб атрымаць пашпарт трэба скласці заяўку ў Акруговы саюз каняводаў, пасля чаго ўпаўнаважаны працаўнік прыедзе да селяніна (уласніка каня), апіша каня і за гэта дзеянне ды за рэгістрацыю каня і выдачу пашпарта возьме аплату.

Як прыгадваюць пажылыя людзі, коні мелі пашпарты ў пасляваенныя гады. Коней было многа, але пакражы — такія як сёння — не здараліся.

* * *

Пра конскія праблемы запытаў я Юзафа Бжану, павятовага інспектара па справах гігіены біялагічнага матэрыялу.

— Уводзіцца адпаведнае абазначэнне жывёл, а ў выпадку коней іх дакладнае апісанне, напр. выгляд спераду, прыметы на галаве (лысіна, віхры), плямкі на шэрсці, рост, абхват грудной клеткі, таўшчыня нагі і г.д.

Сёння прадаць каня з мусу вельмі цяжка. У прынцыпе, калі конь хворы або траўміраваны, зарэзаць яго вельмі складана, бо ёсць толькі адна бойня — у Ясле ў Падкарпацкім ваяводстве, адлеглая ад нас на паўтысячы кіламетраў і завезці туды каня — на практыцы нерэальна.

У Бельскім павеце сёння 17 расплодных пунктаў, у якіх ёсць дваццаць жарабцоў. Усіх коней у павеце каля тысячы. Помню, як у Кашалях каля Орлі ў бадай 1974 годзе рабіў я вакцынацыю ад сібірскай язвы; адбывалася гэта каля святліцы. Тады сяляне прывялі 170 штук адных кабыл, не ўлічваючы жарабят. А цяпер па вёсках вельмі мала коней, найчасцей адзін або і зусім няма.

Міхал Мінцэвіч

Ці тады ўсё польскае чынавенства сумее змясціцца ў цянёк пад Усходнюю сцяну?

Quo vadis, Polonia

Яўген Вапа піша ў „Ніве": „Беларускую вёску Беласточчыны беспрэцэдэнтна выкупоўвае варшаўска-беластоцкае чынавенства (...), а мы ўсяго можам уяўляць як адчувалі сябе амерыканскія індзейцы". А ці не больш блізкім быў бы прыклад Баляслава Пруса з аповесці „Фарпост"? Ці не падобнае да „Drang nach Osten"? Былыя і сённяшнія імперскія дзяржавы, а дакладней іх прадстаўнікі, захоўваюць у сваіх манерах нешта з Übermenschaўскай прывычкі. Ім гэта астаецца ў крыві. Анджэй Шчыпёрскі падкрэслівае: „зусім не былі мы лепшымі ад іншых, столькі сама ў Польшчы было мужнасці, што і подласці, столькі ж вернасці, што і здрады. Але легенда ўкаранелая ў нашым розуме безупынна падсоўвала пакаленням адлюстраванне чыстае, бязвіннае, пакутніцкае. І гэта ішло сумесна з пагардай для іншых". Бадай і надалей гэта трывае. А што будзе далей? Мы ж на парозе ў Еўрасаюз. Зямлю ў Польшчы — і не толькі зямлю — бо і ўсё, што маем, аддаем за даўгі — купляюць замежнікі. Калі ўсё будзе распрададзена, ці тады ўсё польскае чынавенства сумее змясціцца ў цянёк пад Усходнюю сцяну? Quo vadis, Poloniae?

А ўсё ж найбольш нас хваляваць могуць адносіны палякаў да нацыянальных і рэлігійных мяншынь. Рэабілітацыя Райса — „Бурага", ігнаруючая здзейсненыя ім злачынствы, а да таго і прысуджэнне ягонай сям'і грашовай кампенсацыі, з'яўляецца доказам адабрэння ўладамі нацыяналістычных памкненняў некаторых кругоў польскага грамадства. Гэты факт асмельвае нацыяналістаў да безадказнай дзейнасці, а гэтым самым наводзіць непакой таксама ў грамадзян Польшчы, якія мусяць лічыцца нават з эксцэсамі з боку шавіністаў. Праблема можа паглыбляцца, на гэта можа мець уплыў заняпад гаспадаркі, беспрацоўе, збядненне насельніцтва і паглыбленне недаверу — усяму і і ўсім. Асабліва востра заўважаецца рост пагардлівасці заможных да беднаты.

Вяртаючыся да пытання Райса, я вельмі хацеў бы пачуць або прачытаць аб стаўленні да гэтай персоны прадстаўнікоў іерархіі Каталіцкага касцёла. Дагэтуль мне не ўдалося пачуць іхняга меркавання.

Анатоль Маўчун

Калектыў „Арэшкі" існуе з 1972 года, за свае трыццаць два гады дабіўся своеасаблівага стылю і славы

У Арэшкаве песні падаюць з неба

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

„Арэшкі" і Сцяпан Копа (у цэнтры); ззаду — Барбара Пахольска і Яўген Вапа

— Мы ўжо як тыя наркаманы, так уцягнуліся, што жыць без спявання не ўмеем, — кажа Ніна Авярчук з калектыву „Арэшкі".

Каб дабрацца на рэпетыцыі, спявачкі, што жывуць на хутары, два-тры кіламетры ідуць пешшу ў вясковую святліцу. Зімой, калі завее дарогу і рана змярканне, прыпяваюць для адвагі.

Арэшкава ляжыць на вялікай паляне ў заходняй частцы Белавежскай пушчы.

— А мужыкі нашы зайздросны, — смяецца Ніна Авярчук. — Не пускаюць... Мой чалавек, раз кажа: *А коб тэбэ там хто ў рові одкачаў, то пэрэстала б ходыты*? А я яму ў адказ: — *А коб і одкачаў — чы я бы тобіэ прызналася!*

Калектыў „Арэшкі" існуе з 1972 года, за свае трыццаць два гады дабіўся своеасаблівага стылю і славы. Сцяпан Копа, аўтар запісу іх рэпертуару, называе „Арэшкі" жамчужынамі сярод беларускіх калектываў Беласточчыны.

„Арэшкі" — піша складальнік кніжкі Сцяпан Копа: — спяваюць *a capella*, натуральна і свойска, свабодна і з палётам. Паасобныя галасы спявачак — моцныя, чыстыя, гарманічныя, з непаўторнай барвай — у выніку чаго атрымоўваюцца цудныя, поўныя і архаічныя напевы...

Зборнік — падарунак на трыццацігоддзе калектыву (хоць выйшаў напрыканцы мінулага года) — найкаштоўнейшы дар будучым пакаленням. Праца над кніжкай доўжылася пятнаццаць гадоў. Як адзначае аўтар зборніка — песні запісваў у час сустрэч і пры кожнай нагодзе. У выніку — 160 песень, укладзеных у сямі цыклах: *Песні на Новы год і Трох каралёў, агулькі, жніўныя, вясельныя, хрысцінныя, калыханкі і забаўлянкі, розныя...*

Сярод рэпертуару — песні мясцовых аўтараў (іх не ўдалося ўстанавіць) і таксама прыпушчанскія вясельныя прыпеўкі:

Ой, там, пуд лісом/ Мэдвіедь брыкае./ Выставыв яйця — /Дружок лякае...

У зборніку жамчужыны і для этнамузыколагаў — як песня „Панна Марыя", якую выконвалі ў Арэшкаве разам са старажытным абрадам „Хрысток" на свята Трох каралёў. „Хрысток" гэта вянок з лісткоў дуба прыздоблены каляровымі стужкамі, з якім хадзілі дзяўчаты ад хаты да хаты з пажадальнымі песнямі.

Сёння ў калектыве пяць жанчын: Надзея Грушэўская (энергічная завадатарка і кіраўнік калектыву), Надзея Грош, Тацяна Гурын, Ніна Авярчук, Марыя Скепка. 17 студзеня г.г. у хаце апошняй, што на хутары Трасцянец, адбыўся ўрачысты абед з нагоды выхаду кніжкі. Прыехалі спонсары з Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь (5 000 злотых), Ваяводскага асяродка анімацыі культуры (1 000 злотых) і разам з укладальнікам Сцяпанам Копам, у святле тэлекамер уручылі свежы зборнік.

— А цяпер хачу вам пажадаць, каб да зборніка вы прылажылі і касету, — сказала Барбара Пахольская з ВААК.

Ганна Кандрацюк

* Repertuar Zespołów Folklorystycznych Białostocczyzny, zeszyt nr 4, Folklorystyczny Zespół Śpiewaczy *Orzeszki* z Orzeszkowa. Wojewódzki Ośrodek Animacji Kultury, Białystok 2003.

Не поўзаць на каленях перад Амерыкай

У марозны студзеньскі дзень сядзеў я ў хаце ды глядзеў тэлебачанне. Асабліва цікавілі мяне навіны, гаварылася пераважна аб цэнах, якія ўжо павысіліся і аб тым, што чакае нас у хуткім часе.

Пачуў таксама ў навінах, што ЗША дзеля абароны краіны ад тэрарыстаў будуць неўзабаве на лётнішчах, пагранпераходах усіх чужаземцаў фатаграфаваць, браць папілярныя лініі іх рук ды значыць зялёным і чырвоным колерамі. Шкада толькі, падумалася мне, што яшчэ не прыдумалі павесіць дошчачку на грудзях з чарговым нумарам „ахвяры", якая перасякае іхнюю мяжу.

Няўжо цяпер Амерыка хоча стаць жандарам свету і падпарадкаваць сабе ўвесь свет? А чаго ж так наша ўлада падлізваецца той Амерыцы, нягледзячы на „перспектывы", якія амерыканцы даюць нашым людзям, што атрымаўшы візу едуць туды, і многіх іх вяртаюць назад непасрэдна з лётнішча. Трэба, каб нашы ўлады мелі крыху свайго гонару і не поўзалі на каленях перад Амерыкай, як робяць да гэтай пары.

Мікалай Лук'янюк

Вачыма паляка

Адгучалае рэха камісіі

Падляшскі самаўрадавы сеймік папярэдняга склікання што і руш падымаў пытанне стварэння камісіі па справах нацыянальных меншасцей. Будучыя тады ў апазіцыі радныя ад Саюза левых дэмакратаў, як Збігнеў Кшывіцкі, Яўген Чыквін ці Владзімеж Цімашэвіч, не раз даказвалі з трыбуны, як вельмі такая камісія патрэбна і абураліся на кіруючых ваяводствам у той час прадстаўнікоў Выбарчай акцыі „Салідарнасць" (AWS), якія паспяхова блакіравалі гэту ідэю. Лідэр AWS Юзаф Мазалеўскі, і заадно шэф Акцыі ў рэгіёне ды старшыня прафсаюза „Салідарнасць", а таксама маршалак ваяводства Славамір Згжыва малазразумела тлумачылі, што праблемы, якія датычаць меншасцей, рашаюцца ва ўжо дзейнічаючых камісіях і няма падзелу на „тых" і „гэтых" жыхароў рэгіёна, а справы, якія вырашаюцца ў сеймику, датычаць усіх.

Дастаткова даўно (восенню мінулага года) мінуў год ад змены сіл у сеймику, а затым — ва ўправе ваяводства. Збігнеў Кшывіцкі цяпер — старшыня сеймика і шэф клуба СЛД, які кіруе разам з ПСЛ і Падляшскай народнай ініцыятывай (PIL — былымі раднымі „Самаабароны"). Не без прычыны ўспомнілася змаганне за меншасную камісію ў папярэднім скліканні, тым больш, што прадстаўнікі, стартуючыя ў апошніх самаўрадавых выбарах з Форуму меншасцей Падляшша апынуліся ў сеймику балатуючыся са спіскаў СЛД. Прыгадаю, што Беларускаму выбарчаму камітэту, які ўдзельнічаў у выбарах незалежна і самастойна, не ўдалося ўвесці ў сеймік свайго прадстаўніка. За ўстанаўленнем такой камісіі мог бы ў сённяшняй сітуацыі сачыць хоць бы актыўны праваслаўны радны ФМП-СЛД Ян Зенюк, якому яшчэ пры ўладзе правай большасці ўдалося давесці да падпісання дамовы аб супрацоўніцтве Падляшскай управы з уладамі Гродзенскай вобласці. Не ўспамінаю ўжо аб радным Яне Сычэўскім, старшыні Беларускага грамадска-культурнага таварыства, бо ён, мабыць, не ўсяго можа ў сеймику дапільнаваць, паколькі ён член управы, адказны за асвету і культуру, значыць — вельмі заняты.

Аднак, прынамсі палітычная пасляпоўнасць, на маю думку, павінна схіліць клуб СЛД (у ягонай „чыстай" постаці), а асабліва Збігнева Кшывіцкага, узняць ініцыятыву наконт арганізавання камісіі меншасцей. А што ён сёння на гэты конт кажа:

— Праблемы, якія датычаць меншасцей, роўна раскладзены па камісіях, м.інш. культуры і развою інфраструктуры.

Быццам пачулі мы аргументацыю правіцы з папярэднага склікання, неаднойчы дзейнічаючай з блаславеннем іерархаў лакальнага Каталіцкага касцёла.

Старшыня Кшывіцкі, аднак, на гэтым не спыняецца.

— Наша статутная камісія цяперашняга сеймика не бачыла такой неабходнасці. Справа таксама ў ашчаднасці. Ёсць у нас ужо восем камісій. З прычыны якраз ашчаднасці абмежаваны лік радных. У папярэднім скліканні было іх 45, цяпер — 30.

Не ўспамінае ён, што большасць ва ўспомненай статутнай камісіі (ну і, вядома, ува ўсім сеймику, які ўрэшце ж мае вырашальны голас) мае кааліцыя ачоленая СЛД.

Што асабліва цікавае — Збігнеў Кшывіцкі падкрэслівае, што калі б прагучала адпаведная заява, трэба было б яе ўзяць пад развагу. Тое ж трэба было б зрабіць, калі б аказалася, што якія-небудзь інтарэсы меншасцей пад пагрозай. Ну, што ж, заява не прагучала. Мяркуючы па выказваннях старшыні клуба СЛД і стаўленні сённяшняй апазіцыі ў папярэднім скліканні — хто ж меў бы яе скласці?

Пасля маёй размовы са Збігневам Кшывіцкім гэта, аднак, усё мяне трывожыла. У чым тут, у сапраўднасці, справа? Аргумент аб ашчаднасці здаўся мне недастатковым, як кажуць у судзе — не даў я яму веры. Растлумачыў мне гэта адзін з радных ад кіруючай кааліцыі, які захацеў засакрэціцца (партыйная лаяльнасць?).

— Гэта магла б быць падстава вызначыць сферу падзелу ў кааліцыі. Былыя радныя ад „Самаабароны" — рашаючы фактар. Без іх галасоў СЛД з ПСЛ не мела б большасці. А гэтыя панства маюць правыя схільнасці, не вельмі спрыяльныя меншасцям. Маглі б такую ідэю нават і падтрымаць, але ўзамен патрабавалі б завялікіх уступак ад СЛД, хоць бы ў персанальных прызначэннях на пасады.

Калі гэтаму верыць, то СЛД — незалежна ад пытання назначэння меншаснай камісіі — у Падляшскім самаўрадавым сеймику — заложнік некалькіх радных клуба PIL. Не хацеў бы я прарочыць, але можа гэта выявіцца аднойчы ў гэтым скліканні, мабыць, тады, калі клуб Грамадзянскай платформы — Права і справядлівасць (PO-PiS), хоць бы наперакор, зробіць такую заяву. Пачнецца тады палітычны „дым", у агні якога спапяліцца могуць толькі меншасныя інтарэсы. А ўсё — з-за палітычных калькуляцый. У іх меншасці звычайна выкарыстоўваюцца.

Мацей Халадоўскі

Зорка
старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Пяты клас з выхавацелькай Ірэнай Хадакоўскай і настаўнікам беларускай мовы Ігарам Лукашуком

Зубрыла — зорка — гакер

Яшчэ два дні і адпачынак! Зімовыя канікулы.

— Уся школа жыве ўжо канікуламі, — кажа Ігар Лукашук. Ідзем на ўрок беларускай мовы.

— Добры дзень! Добры дзень! — вітаюцца з настаўнікам вучні на калідоры. У зале гучыць музыка, на падлозе гімназісты малююць „цёплыя" гісторыі — на адным пласце паперы аранжавы тыгр прадзіраецца праз джунглі.

А за акном дрэвы ў інеі, траскучы мароз. Заўтра ў Аўгустове школьная ёлка. Прыйдзе Дзед Мароз з мяшком падарункаў.

Мы спяшаем да „rozwydrzonych bachorów" — як празываюць пяцікласнікаў у школе...

— Няпраўда, — кажа настаўнік беларускай мовы, — гэта самы сімпатычны клас у школе!

* * *

Першая сустрэча з класам таксама ў стылі „канікул". Караліна Раца заліваецца слязамі.

— Што сталася? — пытаю выхавацельку, матушку Ірэну Хадакоўскую.

— Не хапае ёй аднаго бала да пяцёркі.

— То на канец школьнага года падцягнешся, — суцяшаем амбітную дзяўчынку.

У чацвёртым класе 16 асоб ходзіць на беларускую мову. Настаўнік прадстаўляе па чарзе: Давід вылучаецца тым, што лянівы, Моніка — зорка, Павел — зубрыла, а Пётрак — сам па сабе сімпатычны.

— Проша пані, — крычаць дзеці, — а наш Павел найлепшы вучань у школе.

Павел Шэшка родам з Гацькоў.

— Найбольш люблю матэматыку і беларускую мову, — кажа. Яго сярэдняя ацэнка па ўсіх прадметах 5,09.

* * *

— Чым жыве клас?

— На чацвёрты дзень Каляд навучэнцы беларускай мовы хадзілі калядаваць. Былі ў Аўгустове і Парцаве. Разам закалядавалі 1 300 злотых.

— І што зробіце з грашыма?

— Наладзім экскурсію па наваколлі, вогнічша з беларускімі песнямі, — думае ўголас настаўнік. Ігар Лукашук ажыццяўляе з дзецьмі праект „Самі пра сябе". У асноўным кранае ён краязнаўчыя пытанні. Дзеці запісваюць легенды і гісторыі сваіх мясцовасцей, сем'яў.

— Я буду даследаваць гісторыю царкоўкі ў Парцаве, — кажа Моніка Каліноўская. — У час зімовых канікул пагавару са старымі людзьмі, запытаю ў бацькоў...

— А я напішу пра гісторыю школы ў Гацьках, — заяўляе Павел Шэшка. Чаму? Бо жыву на месцы, на якім стаяла школа.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Давід Анацік (злева) і Павел Шэшка

Вершы Віктара Шведа

Чаму не хочаш вучыцца?

Спытаў настаўнік з засцярогай:
— Чаму не ведаеш нічога,
Чаму не хочаш ты вучыцца,
Астацца цёмным хочаш быццам?

— Ад свайго часта чую дзеда,
Што калі буду многа ведаць,
Пераканаюся, што ўмею —
Дык вельмі хутка пастарэю.

Толькі паспрабаваў сабака

Выйшаў з хаты малы Якаў,
Да яго падбег сабака.
Ён абнюхаў хлопца вокал,
Палізаў яго па шчоках.

Напалоханая маці
Падбягае да дзіцяці:
— Ён цябе ўкусіў, сыночак?
— Паспрабаваць ён толькі хоча.

Плён VIII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Сумленне

Нібыта цішыня
Аднак штосьці грукоча
Прыемна.
Штосьці ўжо не дае спакою
Цудоўна.
Хвіліны мітусяцца
Хочаш забыць
Але ўсё вяртаецца
Акунае цябе сон
А ў тваёй галаве шум і гоман.
Хаваешся за дзверы
Закрываеш вочы, твар, сябе.
Страх адплывае
Людзі не ўбачаць
Твайго подлага зроку
Тваёй марнай волі.
Стапляюцца рукі і ногі
Галава хіліцца да сну.
Не хоча бачыць каменняў,
Якія мелі цябе прыкрыць.

Сумленне мяняецца на семечка
Якое праглынеш перад
Сном вечнасці.

Анна Герман, Ягаднікі
(„Усмешка лёсу")

* * *

Зімовыя канікулы — час адпачынку.

— Раскажыце, калі ласка, пра вашы гульні.

Аказваецца, амаль усе будуць сядзець дома ля камп'ютэра або перад тэлевізарам.

— Не гуляеце ў снежкі?

Цішыня...

— Ці сустракаецеся з сябрамі?

— Пішам э-майлы, — прызнаюцца сябры. Адзін толькі Давід Анацік — фанат інфарматыкі, смяецца з апошніх. Давід аўтарытэт у віртуальшчыне, сам называе сябе „гакерам". Для яго як плюнуць — зрабіць вэб-старонку, прыдумаць гульню...

— Інтэрнэтныя гульні гэта нудота! Хіба што...

— А можа створым сайт пра наш клас? Вядома, па-беларуску...

Зорка

Скарб

Як шмат якія дзеці з пачатковай школы, Аля і Аня ўключыліся ў збор грошай на лячэнне дзяцей разам з тысячамі валанцёраў Вялікага аркестра святочнай дапамогі. Цёпла ды выгадна апранутыя, рушылі са штаба са значкамі, лістамі з сэрцамі-наклейкамі ды пазначанымі скрыначкамі ў горад. Вядома, мабыць, цікавей было б у цэнтры Беластока, бліжэй палаца Браніцкіх, дзе праводзіўся канцэрт і дзе сабралася некалькі тысяч чалавек, і больш людзей можна было б сустрэць, загаварыць да іх, атрымаць грошык у скрыначку. Але валанцёраў штаб рассылаў усюды — і на ўскраіны, і на прадмесці. Каб бяспечней і весялей правесці час, узялі дзяўчаткі з сабою Анінага дваюраднага брата Костуся, ужо ліцэіста, хлопца рослага, як кажуць у нас — здаровага. І аж да прыцемкаў — а ноч у студзені хутка нахлынула над горад — тупалі яны па засыпаных снегам вулачках паміж асабнякамі і камяніцамі.

— Ідзем, пагрэемся куды, ці што! — стаў біцца рукамі змерзлы Костусь. — Можа, запрасіў бы хто нас у хату...

— Ты што... Не будзем жа прасіцца. А вядома, хто які дзе жыве? — пацерла пачырванелы нос Аня.

— Можа, вызвем таксі?

— Гэта ж каштуе.

— А са скрынкі ўзяць не можам? — здзівіўся Костусь. — На таксі нам хопіць дзесяць злотых. Належыцца нам значна больш. Дарэчы, маглі б зайсці нават на якую гарбату ў бар.

— Ты што сабе думаеш! — Алю аж скаланула абурэнне. — Важны тут кожны грошык. Дабярэмся на аўтобусе. У штабе пагрэемся. Падумаеш, прастылі!

— Ну, дык на здароўе! — яхідна заўсміхаўся юнак. — Збіраем жа на хворых дзяцей!

Селі на аўтобус з нумарам тры. „Тройкі" ездзяць часта, і ў цэнтр Беластока можна на іх дабрацца досыць хутка. Выйшлі над рэчкай Белай, кавалачак да месца, на якім народ гуляў на свяце добрых сэрцаў.

— Ну, не буду з вамі валачыцца. Справіцеся самі! Самаранкі! — Костусь рушыў адзін у бок, адкуль чулася музыка. А дзяўчаткі сталі далей выглядаць людзей, не аздобленых сэрцайкам. Людзі спяшаліся, хто ўкідаў грошык у скрынку, хто не, але кожны спагадаў змерзлым дзяўчаткам.

Але не ўсе. Двух бамбізаў учапіліся за скрыначку.

— Ого, цяжкая! — зарагатаў дзядзька ўчорнай куртцы. — Хопіць на пляшку!

Дзяўчаткі з плачам папляліся ў бок, адкуль гучала радасная музыка і цешыўся народ.

Больш за сто разоў у гэты вечар благія людзі адабралі ва ўсёй краіне супольны скарб добрых сэрцаў.

Міра Лукша

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Палац у Ружанах

Замкі Беларусі

У Ружанах, што ў Пружанскім раёне, захаваўся самавіты палац Сапегаў. Хоць рэзідэнцыя беларускіх магнатаў зруйнаваная — усё ж захавала поваб і моц гісторыі.

Палац узнік на зломе XVII і XVIII стагоддзяў і неаднойчы быў зруйнаваны ваеннай навалай. Сапегі аднаўлялі, рэстаўрыравалі, перабудоўвалі сваё сямейнае гняздо.

Самы вядомы прадстаўнік роду — Леў Сапега, канцлер Вялікага княства Літоўскага, аўтар славутых Статутаў ВКЛ.

Найбольшы росквіт рэзідэнцыі выпадае на другую палову XVIII стагоддзя. Ружаны праславіліся як цэнтр еўрапейскай культуры. Пры палацы Сапегаў знаходзіўся тэатр, працавала галерэя, бібліятэка, музычна-оперная школа. Тут ставіліся пастаноўкі Жана-Жака Русо, капельмайстар К. Чыпрыяні вучыў прыгонных сялян іграць на скрыпцы. Побач будынкаў знаходзіўся парк і аранжарэя, у якой гадавалі экзатычных звяроў і расліннасць.

Апошнія шкоды былі нанесены ў 1944 годзе. Жыхары Ружан мараць пра адбудову палаца і ўзнаўленне культурна-мастацкай дзейнасці.

Зорка

Конкурснае пытанне: Назаві найбольш вядомага прадстаўніка княжацкага роду Сапегаў?

Адказ на конкурснае пытанне ў 52 н-ры: Татарскі хан, які жыў у Лідскім замку называўся Тахтамыш.

Узнагароды — кніжку Георгія Валкавыцкага „Белая вязь" выйгралі — **Агата Балтрамюк** з Дубін і **Аня Раманюк** з белгімназіі ў Гайнаўцы. Віншуем!

Ведаю... але не скажу!

— Што адбудзецца ў пятым томе культавай кніжкі Іаанны Ролінг „Гары Потэр"?

Мы запыталі ў навучэнцаў беларускай мовы. Адказы дзяцей можна падзяліць на дзве групы: тых, хто прачытаў усе папярэднія часткі і згодна атмасферы кніжкі ў некаторых справах захаваў тайну, і тых, хто не чытаў... але ведаў! Паслухайце:

Кася Сцепанюк,
V кл., Беласток:

— Думаю, што ў пятай частцы кніжкі Іаанны Ролінг „Гары Потэр" будзе многа непрадбачанага. А чаму? Таму, што арол, пад якім скрываецца благі Лорд Вальдэморт будзе змагацца і нішчыць добрых чараўнікоў. Я чула таксама, што памрэ адна з галоўных персанажаў, але не скажу хто — не хачу, каб вы ведалі наперад, пакуль прачытаеце кніжку. Пятая частка будзе называцца „Гары Потэр і Ордэн Фенікса". Хто ж той — Ордэн Фенікса? Некаторыя мае сябры мяркуюць, што гэта будзе група, якая пойдзе змагацца з Лордам Вальдэмортам, апошнія — бачаць іх місію ў іншым. У Польшчы кніжка выйдзе 31 студзеня, у сем гадзін раніцы. Думаю, што ў гэты дзень ля кнігарняў будуць выстройвацца доўгія чэргі. Я перачакаю гэты „бум", у час зімовых канікул буду гуляць з сябрамі.

Эва Бароўская,
VI кл., Пілікі:

— „Гары Потэр" мяне не цікавіць, я не люблю магіі.

Аляксандра Крукоўская,
VI клас, Пасынкі:

— Люблю „Гары Потэра", кніжка паказвае лёс хлопчыка, у якога няма бацькоў. З нецярплівасцю чакаю наступнай часткі.

Кася Нарэўская,
VI кл., Банькі:

— Не люблю магіі... І не цікавяць мяне такія кніжкі.

Марцін Савіцкі,
VI кл., Аўгустова:

— Яшчэ не чытаў „Гары Потэра", але прачытаю.

Агнешка Сідарук,
VI кл., Бельск-Падляшскі:

— Кажуць, што „Гары Потэр" гэта кніжка пра магію і мне здаецца, што яна вельмі цікавая. Калі прачытаю, змагу напісаць больш на гэтую тэму.

Зорка

Польска-беларуская крыжавпанка № 5

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 1: Аснова, даль, яблыня, карта. Сябра, роды, ванна, Галя, Ас.

Узнагарод — касеты з беларускімі казкамі і песнямі — выйгралі: **Анэта Свентухоўская**, **Аня Зубрыцкая**, **Юстына Банькоўская**, **Агнешка Апольская** і **Віялета Плашкевіч** з Нарвы, **Аня Баравік** з Елянкі, **Юстына Данельчук** і **Рафал Тамашук** з Дубін, **Раксана Казлоўская** і **Агнешка Ляўчук** з Новага Корніна. Віншуем!

Узнагароды можна ўзяць у рэдакцыі „Нівы", або чакаць іх у сваёй школе.

Пакуль у Бельску не адкрылі беларускі ліцэй, ён навучаў беларускай мове дзетак у вясковых школах — у Стрыках, Мокрым, Райску...

Называлі яго „дзядзька”

У часе апошняга перапісу насельніцтва ў Польшчы, у запрошлым годзе, маладая жанчына запытала ў спадарыні Тамары Мірон:

— Хто вы па нацыянальнасці?

— Беларуска, — адказала яна.

— Як, вы ж жывяце ў Польшчы! — здзівілася перапісчыца.

— Дык вы ж у мяне не пыталі пра грамадзянства, а пра нацыянальнасць!

— А па-якому размаўляеце?

— Ні па-якому, — крыху ўзлавалася гаспадыня, — бо я жыву адна. Але калі хтось прыходзіць, то размаўляем і па-польску, і па-беларуску, і па-руску, і па-ўкраінску. Запішыце польскую і беларускую мовы. Так будзе добра.

* * *

Новая пацыентка, якую палажылі ў нашу палату, сказала мне з ходу: „Я — праваслаўная!” Было ў яе голасе крыху асцярожнасці, але я яе супакоіла: „Ну, і добра, будзем святкаваць разам”. Каб было больш пераканаўча, я дадала, што працую ў „Ніве”. „А мой бацька навучаў беларускай мове ў Бельскім ліцэі. Можа чулі, Ілья Захаравіч Бернат?!”

Хто б не чуў пра гэтага настаўніка-легенду! Колькі разоў сяброўкі з рэдакцыі Марыя Федарук і Валя Жэшка ўспаміналі яго добрым словам, і з гэтых успамінаў паўставаў вобраз патрабавальнага і справядлівага настаўніка, добрага і спагадлівага чалавека, разумнага старэйшага сябра, які ўмеў прывіць любоў да беларускай мовы.

Праўду кажучы, заўважае спадарыня Тамара, беларуская мова пасля смерці бацькі (27 студзеня мінула 30 гадоў ад таго дня) неяк выбралася з нашага дому. Тады мы ўжо больш гаварылі па-польску, маці і дзве дачкі: я і старэйшая Наталля, якую — з украінскай — звалі Таля. Бацька ж наш быў украінцам. А стаў ён беларусам у Навагрудку, куды ў дваццатых гадах прыехаў працаваць пасля заканчэння настаўніцкай семінарыі на Украіне. Хутка вывучыў беларускую мову.

Ілья Захаравіч Бернат (1897-1974)

Тамара Мірон — дачка Ільі Берната

Фота Ады Чачугі

У Навагрудку, расказвае спадарыня Тамара, у часе нямецкай акупацыі дзейнічалі беларускія школы. Бацька вучыў у падставовай школе, а Аляксандр Орса, бацька Алы Орсы-Рамана, якая цяпер жыве ў Нью-Йорку, быў інспектарам асветы. Алюньця і Галя, яго дачушкі, былі маімі сяброўкамі. Вельмі шкада, што не давялося нам сустрэцца ў восемдзесят дзевятым годзе, калі Ала была ў Беластоку...

На Беласточчыне, куды трапіла сям’я пасля вайны, Ілья Захаравіч Бернат (10.11.1897 — 27.01.1974) або Ілько, як называлі яго па-ўкраінску, прапрацаваў дваццаць гадоў. Пакуль у Бельску не адкрылі беларускі ліцэй, ён навучаў беларускай мове дзетак у вясковых пачатковых школах — у Стрыках, Мокрым, Райску. Інспектарат асветы, успамінае яго дачка Тамара, плаціў вясковым настаўнікам невялікія грошы, дык людзі стараліся дапамагчы прадуктамі. Памятаю, як бацька прывозіў то нейкую каўбаску, то кавалак сала, то крыху асыпкі ці бульбы для кароўкі, якую мы трымалі да сорак сёмага года.

Да Бельскага беларускага ліцэя бацька быў прывязаны як мала хто, кажа спадарыня Тамара. Аж да пенсіі даязджаў на працу з Беластока, куды бацькі пераехалі ў 1958 годзе, каб быць разам з дочкамі. Пакахаў Беларусь як нешта самае блізкае, але ў гадавіны Тараса Шаўчэнкі стараўся зрабіць у ліцэі ўкраінскі ўрок.

* * *

Усё жыццё працавала спадарыня Тамара ў рахункаводстве. Цяпер, у бальніцы, акуратна рахуе ў вялікім сшытку: якія прыпісаны ёй працэдуры, што ўжо адбыла, колькі яшчэ засталося... Марыць пра дом, хаця там яе ніхто не чакае. Мо толькі кватарант, хлопец з ваколіц Семяноўкі, студэнт універсітэта. Заўсёды бярэ на кватэру праваслаўнага хлопца ці дзяўчыну — усё ж крыху весялей, ды і ямчэй у кішэні пенсіянеркі.

Раніцай куплю, кажа яна, свежы хлеб і газету, пасля пайду на рынак, усё ж там таннейшае. А калі нічога не купляю, дык і так на людзей пагляджу, знаёмых сустрэну, пагавару. Бо дома дык нават ні ката, ні сабакі не маю. А на каго ж бы іх кінуць, калі ўсё часцей у бальніцах бываць трэба пасля аперацыі бядра...

Калі была маладая, спадарыня Тамара спявала ў хоры пры Беларускім таварыстве, якім кіравала Людміла Панько. Там і з будучым мужам пазнаёмілася. Сёння, кажа, засталіся адны магілы: памёр бацька, тады маці, муж, трагічна загінуў трыццацігадовы пляменнік Ігар. Можа разлічваць толькі на сястру, інжынера-будаўніка на пенсіі, пляменніцу Ніку і яе сына — ліцэіста Яраслава.

Мы з сястрой, кажа спадарыня Тамара, на могілкі ходзім штотыдзень. Пойдзем у нядзелю, сядзем, сонейка свеціць, а мы сярод сваіх, быццам бы ніхто і не адышоў з жыцця... Пасля абедні ў царкве Усіх Святых абыдзем усе „свае” магілы, запалім свечкі — не глядзі, што зіма. Я ў парк не хаджу. А на могілках маё другое жыццё. Тут ляжаць мае сваякі і суродзічы, якія апынуліся ў Беластоку разам з намі. Яны ж, як і мой бацька, навучалі ў беларускай школе пры немцах. З намі тады прыехалі настаўнікі Фёдар і Анна Скокі, настаўніца Еўдакія Асташэвіч, а таксама сакратарка той жа школы. Анна Скок і Еўдакія Асташэвіч пахаваны недалёка ад нашых бацькоў. У Анны Скок тут нікога няма, муж яе пахаваны ў Бельску. Ну, як жа не прыбраць такую магілу! Тут жа ляжаць і Нікалаевы, сям’я сястрынога мужа, а сярод іх і род Волкавых, бацькоў вядомага ў Беластоку мастака-фатографа Віктара Волкава. І так, пакуль абыдзем магілы ўсіх сваіх, дык і дзень канчаецца.

* * *

Высветлілася, што і тут, у бальніцы, спадарыня Тамара быццам сярод сваіх. Бо вось жа, аказваецца, і маму рэабілітанта, і маму лекаркі Ілья Захаравіч вучыў у Бельскім беларускім ліцэі. А калі ў нядзелю лекарка з сям’ёй паехала да цешчы, дык мужава цётка аказалася таксама яго былой вучаніцай. Вучні за ім проста прападалі, сказала яна, хаця вымагаў ён ад іх шмат. Любілі яго, як мала якога настаўніка. Нават называлі яго цёпла: „дзядзька”.

Ада Чачуга

Дзяцінства заварожанае хвалямі (5)

(заканчэнне; пачатак у 1 н-ры)

Вайна і яе наступствы

Вядома, пра такую падзею пачалі гаварыць усюды, хаця я якіх-небудзь асаблівых хваляванняў не прыкмеціў. У вёсцы не было ніякіх устаноў, ані службовых людзей. Толькі ў школе мы пачалі збіраць металалом — для дзяржавы, „на пакупку зброі”. З Абрубу, здаецца, на вайну пайшлі толькі два хлопцы, наш сусед з хутара, Юзюк Беглік — ён якраз прыйшоў да мяне, каля бацькавай студні мы аб нечым гаварылі. Быў гэта мілы і спакойны хлопец. Даў мне яблык і з усмешкай сказаў: „Па-польску гэта — яблко”. Гэта была апошняя наша сустрэча. Пазней ужо пра яго ніхто не чуў і не ведаў. Ці хто яшчэ пра яго памятае? Ну, і мой сваяк Іванька Чарняўскі. Ён, як прыйшлі саветы, вярнуўся з палону. Нават нейкі час хадзіў у польскім шынялі і „рагатыўцы”. А так змена ўлады, на хутарах, на пачатку мне здавалася нічым незвычайным. У школе толькі настаўніца пачала вучыць па-беларуску. З-за былой — недалёка ж — мяжы пачалі нас часам наведваць сваякі-„васточнікі”. З часам мой дзядзька каваль пайшоў у трактарысты. Бацька паехаў у Беласток працаваць на будове аэрадрома. А я — пачаў жыць у дзядзькавай хаце. Надалей хадзіў у школу, сяброў наведваў. Найбліжэйшым маім сябрам усё ж астаўся Рэкс. З ім мы гулялі па Ляшчоўцы — быў гэта куток над возерам у выглядзе паўастраўка, за якім ляшчы вадзіліся (а і ляшчыны там у кустах было нямала). Там, з боку Івана Малька, расла над возерам бяроза. Расла яна пахіленая над вадой, яе галінкі-косы нават датыкалі вады. А амаль пад гэтымі ейнымі косамі, на беразе (але ўжо ў вадзе) бурліла маленькая крынічка. Зімой гэтае месца не замярзала, затое ўлетку, навокал крыніцы — вада ледзяная. Калі прыйшоў часам нехта, што яшчэ пра крынічку нічога не ведаў, я заўсёды імкнуўся яго ўцягнуць у самую халодную ваду, зваў прыйсці пад каменем рака паглядзець. А ўжо на Юстынавым баку, нават далёка ад берага, было дно з самога пясочку. Там таксама можна бы кагосьці абмануць, бо ў вадзе не кідаецца адразу ў вочы, што там ёсць упадзіна. Яе можна было і абысці маючы вады крыху вышэй калена. А вось, каб пайсці напрамкі, можна было акунуцца ў вадзе з галавой. Рэкс, вядома, вады не баяўся і абмануцца не даваўся. Калі я, каб не падзяліцца з ім хлебам, кідаў у ваду камень, ён умеў гэты камень знайсці. Клаў яго перада мною, а потым хапаў зубамі за паліну маёй курткі, вурчаў і задам цягнуў мяне ў возера. А калі я скідаў з сябе куртку, ён хапаў за штаны. Але была гэта забава. А пра ягоную мудрасць можна было б вельмі многа што казаць. Толькі жыццё ўсё менш пакідала часу на забавы. Трэба было ў гаспадарцы памагаць, кароў пасвіць — і гэта таксама пры возеры адбывалася. Плаваў я часта, але на другі бок мяне не цягнула, тамашнія дзеці празываліся. Соня і Хрэсьця нават прыдумалі прыспеўку: „А Каменкі ў гары, нягодныя, чорт бяры. А Абруб наш у лагу, нацешыцца не магу”. Што ж, нават і ў малых цяга да нязгоды. А можа і імкненне быць лепшымі? Малаважныя былі гэта справы. Зрэшты, дагэтуль хутары нашай вёскі былі воддаль ад большых дарог, тут ані войска не перасоўвалася — чыгунка бегла ж напрыканцы возера. Горада ніякага паблізу не было, дык наш „кут” мог лічыцца ў меру спакойным. Але што на свеце можа быць трывалым? Саветы, прагнаўшы палякаў, абяцалі ўкараніць свой „рай”. Людзі нават радаваліся — „свае прыйшлі”. Але абяцаны рай не стаўся пераканаўчым. Калі немцы прыйшлі, адразу пачалі мяняць парадкі. Праўда, на пачатку быццам было ўсё нармальна. Але калі немцы пачалі страляць жыдоў і савецкіх служачых, а „партызыны” — кулакоў і „неблагонадёжных”, якіх ліквідаваць раней не паспелі савецкія ўлады, абяцаны чужынцамі „рай” станавіўся рэчаіснасцю. Пасля таго як „партызаны” застрэлілі частку братоў майго бацькі — які цяпер апынуўся ў нямецкім лагеры ваеннапалонных — я мог лічыць сябе, што я нічый. Была вайна і я жыў часам у сваякоў, часам у суседзяў. Цяпер маляваць сваё маленства ідылічнымі колерамі было б непрыстойна. Праўда, і тады здараліся выпадкі і смешныя або дзіўныя... Раз, у зімовую мяцеліцу, сусед грэў салдатам лазню. Мне даручылі, каб на падлогу ў сенцы, там дзе яны раздзяваліся, пакласці куль саломы. Пабег я ў пуню, схапіў цяжкі куль і бягом у лазню. Вецер снегам вочы засыпае, дзьме без літасці, ну і ўрэшце я ў лазні. І шок, я аслупянеў. Пару хвілін таму тут было мнагалюдна, пара шугала дзвярыма і ваконцам. А цяпер? Унутры, як і на двары, такі самы холад і зусім пуста і ціха, быццам чары якія. Калі я зразумеў сваю памылку, дык спалохаўся. А ну ж нехта бачыў, што я пры суседняй лазні затрымаўся з саломай, замест занесці яе куды трэба... А калі мы жылі ў Зябках, тады было ўжо лета, перад нашай хатай затрымаўся нямецкі афіцэр. І якраз на дарогу выйшла цётчына курыца з куранятамі. Я хацеў хуценька яе прагнаць, крыкнуў „акыш”, а тут немец

Плён VIII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

* * *

Я не для вас
І не для цябе
Час складае мае думкі
Бягу ў свет
Але куды?
У цёмнай ночы не бачу
У маіх вачах слёзы
Усё плача са мной
Толькі месяц спазірае з-за хмары
І бачыць мае слёзы

Сон пра жывых

Родны вобраз краю,
Смутак і радасць.
Лясы, хаты...
Поўныя смутку,
Нядолі.
Толькі я
Сяджу ў цяні дрэў
Са слёзамі ў вачах
Бачу я перад сабой
Вас... як жывых
У ціхай песні душы

Марта Купчук

* * *

Ля чаромхі сцежка зарослая дзёрнам
Над Чаромхай хутка праляцела каханне,
пакідаючы вочы тугі.
Пад чаромхай няздзейсніўшыя мары,
За чаромхай векапомная Арлянка,
сведка спатканняў і расстанняў.
Хвалі ракі спяшаюць паглытаць
слёзы, журбу, боль.
У галінках закукавала зязюля.
У чаромсе новая надзея...

* * *

З пажоўклай здымкі
глядзяць незабытыя вочы.
Не гаворачы
абяцаюць залатыя горы,
краіну маладой вясны,
у якой навек закаранілася каханне.

Вочы не маглі абмануць
яны ж адбіццё душы.
Хто іх напалохаў?
Хто адабраў ім блеск,
пакрыў туманам,
назаўсёды адгарадзіў
жалезным дротам?

На калючы дрот
каваль знойдзе спосаб,
Горш з паламанай душой.
Мо якраз удасца яе зварыць!
Трэба прабаваць!!!

Вера Масайла

Гайнаўскі, чаромхаўскі, еўрапейскі сплін

Затопленыя антарктыды Ірэны Стэльмах

Ірэна Стэльмах

Чаромха сплін

Цяжкі нутраны фольк, правінцыі пульс
і скарб асяродкаў культуры, калектыў гаспадынь,
ансамбль танцавальны, дуэты, трыялеты ды хор.

Хахлацкія прыспеўкі, па-юнацку рэжа гармонік,
уздымае жывых дзевяностагадовых дзядзькоў.
Бароды гайдаюцца, вяртаецца прывід ды быль.

Рэдактар мясцовы нос наставіў, і слёзка ўваччу —
а чаму б не знайсці касмічную тоеснасць тут.
А памяць аб Галі трымціць, пярэвяслы хмелю звівае.

Memento

Марфа — дачка Пракопа
і Еўдакіі з Асаўца
кума Віталія галубка наймалодшая

у свет замуж пайшла хоць з пасагам
за баламутнага Йвана
душа хаты лебядой зарасла

простыя чалавечыя гісторыі
вандроўкі людскія
лёс намі кідае бы жменяй пуху

што з імён прозвішч ды метрык
кожны з нас — толькі ананім
праўда жыцця — дзяружка з крышын

Пераклала з польскай
Міра Лукша

Апошняя кніга, выдадзеная Мастацка-літаратурным згуртаваннем „Kartki" — падвойны збор твораў. Да зборніка вершаў паэтэсы, родам з Гайнаўкі, Ірэны Стэльмах *Retrospekcje* дададзены малюнкі Юркі Федарука, родам з Рыбал — *Obrazy*. Абое яны вучыліся ў сталіцах — Ірэна ў Кракаве (тэатралогія), Юрка — у Мінску (жывапіс), абое амаль аднагодкі (сямідзесятыя). Абое моцна адчуваюць роднае.

Кніга Ірэны Стэльмах пэўнага роду трыпціх, а адна з яго частак — развагі наконт Беласточчны.

— У час маіх студыяў у Кракаве, — расказвае паэтэса, — я зайздросціла горцам гонару, з якім гаварылі пра сваё паходжанне. Мае знаёмыя з Падляшша не экспанавалі факту, што яны згэтуль. На пачатку здавалася мне гэта комплексам. Уцякалі яны ў саламяную польскасць альбо шукалі іншых формаў, каб больш сябе акрэсліць. Норма „тутэйшы", зразумелая ў нашых рэаліях, па-за імі атрымлівалася „першабытная", не вельмі выразная. Папраўдзе, яна вельмі каштоўная. Толькі што для майго пакалення „тутэйшасць" — форма пераходная. Тутэйшыя былі нашы дзяды, можа, яшчэ бацькі. А мы вырастаем на палякаў, беларусаў, украінцаў. Маё вялікае шчасце, што я нарадзілася на Падляшшы. Трэба гэта толькі ўмець выкарыстаць. Гэтае месца дае вельмі шмат творчых сокаў. Для мяне на падляшскую духоўнасць накладваецца яшчэ сваяцтва з тэрыторыяй Міжземнага мора, міф Украіны, бо карані маёй сям'і сягаюць на Падолле. Думаю, што калі б мяне выхоўвалі ў Варшаве, пісала б я не вершы, а хаўтурныя папсовыя песенькі. Рэтраспекцыі? Мае вершы гэта трохі „рэтра" — і падыход да тэмы, і фраза, але рашаючыся на гэты загаловак, я акцэнтую мінулае. Паэт — медыум, якое спайвае тое, што было, з тым, чым ёсць. Я не экспаную ў гэтым зборніку сябе, хутчэй спадчыну Міжземнага мора і радзіму... Не адкрываю новых кантынентаў, хутчэй — затопленыя антарктыды...

(лук)

мяне паклікаў. Гаварыў ён па-руску і запытаўся: „Якім словам праганяў бы куранят?" Я адказаў: „апыля". „А як парасят?" Кажу: „авыц". „А свіней?" „Аюсь". „А авечак?" „Ашкіра", — кажу. „А казу?" Я збянтэжыўся, у нас казы не было і я сказаў, што не ведаю, бо гэтыя клічкі прыдуманыя бабамі, і хто ўсур'ёз будзе з жывёлай размаўляць. Ён спакойна паясніў: „З жывёлай, як з чалавекам, трэба ўмець размаўляць: ветліва і лагодна". А потым дадаў: „Нават і ў час няшчаснай вайны". Урэзалася гэта ў маю памяць, хаця раней гэтая размова здалася мне смешнай. На жаль, не ўсё смешнае бывае радасным, а тым больш шчаслівым. Цяпер, у вайну, уміраць дапамагаюць нават суседзі, часам бескарысна... Раз начаваў я ў Абрубе, у дзядзькі Пётры Харака. Яшчэ спаць мы не ляглі, калі пачалі гарэць будынкі за возерам, Маркоўскага ў Псуі. Нават праз зачыненыя вокны было чуваць як раўлі каровы, вішчэлі свінні, крычалі ў роспачы людзі. Згарэлі там дзеці — дзяўчынка і хлопчык — мае школьныя сябры-аднакласнікі. Партызаны за нешта „адпомсцілі". Крыху пазней ноч правёў я ў Слабадзе ў дзеда Васьковіча — „Мароза". Адтуль мы глядзелі зарыва над Вугламі, вёскай каля Псуі. Немцы яе палілі з жыхарамі. Глядзелі на пажар і партызаны, якія прыехалі ў Слабаду па самагонку. Яшчэ пазней затрымаўся я ў Івана Малька ў Абрубе. Ноччу прыбегла па снезе босая Матрона з хлопчыкам на руках. Плакала, што Юстына заб'юць, бо п'яныя партызаны патрабуюць, каб паказаў дзе маіх дзядзькоў „скарбы" схаваныя. Начавалі мы з Мішкам у кустах, каля возера. Над раніцай паведаміў мяне сваяк, што ў Слабадзе згарэў у сваёй хаце „Мароз", цётку застрэлілі ў агародзе, дзіця паспела пераняць яе суседка... Вось і зноў я на Доўгім возеры. Шлёпаюся ў мокрых лапцях, змочаных анучах, у бабскай куртцы без гузікаў, падпярэзаны путам. Адліга, неба шэрае, і на душы цяжар — новае гора. Быў тады пачатак 1944 года, а мне ўсяго толькі 13 гадоў.

Немцы, адчуваючы час адступлення, арганізавалі „блакаду". Насельніцтва зоны партызанскага ўплыву вымушана было перасяліцца на другі бок чыгункі. Таго, хто тэрмінова не паспеў гэтага зрабіць, адпраўлялі ў Нямеччыну. З Абрубу туды папаў Лёнька Давідовіч. Цераз лясны гушчар пайшоў нямецкі другі фронт. Смерць павялічыла сваё жніво.

Калі мне, напрадвесні, прыйшлося быць у Абрубе, панавала там мёртвая цішыня. Пэўна ад стагоддзяў не было тут так бязлюдна і пуста, як зараз. Нідзе ні жывой душы. Нават і возера ў той час стаяла моўчкі. Юстынава лодка ляжала на беразе дном уверх і ўсё было зусім ціха. Хацелася мне падумаць пра нешта, хаця б крыху радаснае. Прыгадалася мама, дакладней адзіныя два імгненні, якія захаваліся ў маёй памяці. Мой зрок зачапіўся за від другога берага возера, а перад вачыма з'явіўся Гірша, жыд, якога паліцыянты там застрэлілі. Ён шыў у нас з краўцом. Калі іх гналі з Зябак у Празарокі расстрэльваць — уцёк. Не хаваўся, і кончылася. Што ж асталося па маёй маленькай Айчыне? Пустыя хаты, пустое поле, крыжы, могілкі... і памяць.

Неўзабаве прыйшло вызваленне. Пачалі вяртацца людзі. Некаторыя, так як сусед Мішка і ягоны дзядзька Васіль Малько — з польскага войска, Юлісь Беглік — з савецкай арміі, Ванька Чарняўскі на гэты раз ужо не вярнуўся (Колі, не было ўжо даўно). Асталася адна старэнькая іхняя маці. Не вярнуліся і многія іншыя жыхары нашай маленькай вёсачкі.

Візіт

Пасля нейкіх дваццаці гадоў ад таго часу, як з волі капрызнага лёсу прыйшлося мне развітацца з Глыбоччынай, ізноў здарылася мне нагода вандраваць дарогамі, якія М. Танк назваў „закалыханымі жытам". Ад дваюраднай сястры Гэрці (сёння па закону яна Вера) Маліноўшчанкі дастаў я запрашэнне. Паехаў. Было гэта ў палове красавіка 1969 года. Пасля двух сутак падарожжа і начлегу ў Гродне, надосвітку правадніца абвясціла: „Зябкі". Адчыніла дзверы, апусціла ступенькі вагона — гэты сімвалічны для мяне цяпер мост, з зямлёй бацькоў маіх — і я апынуўся на пероне. Але сімвалічнасць, хаця яна і ілюзорная з'ява, можа аднак закружыць галаву, выціснуць нават слёзы. На станцыі, на баку стаялі вагоны. У іх жылі рамонтнікі. Чаму яны не спалі і чаму якраз у гэту хвіліну гарманіст іграў паланез Агінскага „Развітанне з Радзімай" — хто ж гэта ведае. Зрэшты, гэты твор у Беларусі быў тады вельмі папулярны, а мне і так ад узрушанасці цяжка было ўстрымацца. Усю дарогу ў цягніку я запоўніў успамінамі, а цяпер?..

Наведваць сваю вёску пачаў я ад могілак. Ды і па дарозе гэта было. Пакланіцца пайшоў тым, з кім ужо сустрэцца не будзе дадзена. Наведаў сваякоў, у Юстына быў. Якая ж радасць была. Пару гадоў пазней з жонкай сюды прыехаў. Ідучы з Зябак у Абруб, пры канцы Доўгага возера, я амаль не анямеў са здзіўлення. Перад намі, на заліўным лугу як вокам абняць, раслі касачы-ірысы. Гэтыя кветкі я бачыў толькі ў дагледжаных гарадскіх агародчыках. Крыху пазней, з нагоды Яна, жонка на Ляшчоўцы вянкі з Юстынавай лодкі кідала ў возера... Пад лодкай, у вадзе, над залатым пясочкам можна было назіраць цэлыя касякі серабрыстых рыбак, якія падплывалі, цешучы зрок бліскучымі рухамі, то спалоханыя аддаляліся. А вада ў возеры была такая празрыста-чыстая, што жонка чэрпала яе ў прыгаршчы і піла са смакам.

Анатоль Маўчун

www.svaboda.org

Паважаны чытач! З гэтага нумара мы будзем распавядаць Вам аб жыцці, так бы мовіць, віртуальнай Беларусі. У гэтае паняцце лічым патрэбным укласці не толькі паведамленні аб падзеях і фактах, што мелі месца ў Рэспубліцы Беларусь.

Беларускі Інтэрнэт альбо Віртуальная Беларусь (каму як больш падабаецца) уяўляецца нам як звычайная віртуальная краіна ў звычайным віртуальным свеце, гэта значыць сусветнай павуціне. Кожны сайт як нейкі горад можа быць вялікім ці маленькім, цікавым ці не вельмі, толькі з'явіўшымся ці настолькі старым, што аб яго існаванні забыліся нават колішнія бацькі-распрацоўшчыкі.

Наведаць кожны горад-сайт Віртуальнай Беларусі, а тым больш распавесці аб ім — справа цяжкая. Але гэта не значыць, што яе не трэба рабіць. Як, дарэчы, варта і ў рэальным жыцці наведваць тое, што мае хоць маленечкае дачыненне да Беларусі, яе людзей, культуры, мовы, гісторыі.

Ну а пачнем мы свае віртуальныя экскурсіі з сайта Радыё Свабода.

Беларуская служба гэтага радыё існуе ўжо больш за палову стагоддзя. Разам з тым, інтэрнэтавы сайт праграмы, як і большасць інфармацыйных сайтаў з'явіўся параўнальна нядаўна — каля сямі гадоў таму.

Калі карыстальнік Інтэрнэта захоча даведацца, што адбываецца ў Беларусі і вакол яе, то значную частку свайго зацікаўлення ён зможа насыціць наведваючы адрас **www.svaboda.org**. І гэта не рэклама нашай газетай дадзенага сайта — гэта факт. Навіны, якія з'яўляюцца галоўным сэнсам існавання кожнага інфармацыйнага партала, абнаўляюцца штодня, за выключэннем выхадных. Зразумела, амаль усё тое, што гучыць у свабодаўскім эфіры, знаходзіць сваё адлюстраванне і на сайце. Архіў навінаў утрымлівае паведамленні са снежня 1998 года. Таму з многімі важнейшымі падзеямі беларускага грамадска-палітычнага, эканамічнага і культурнага жыцця карыстальнік можа пазнаёміцца не выходзячы з адной, г.зн. свабодаўскай старонкі ў Інтэрнэце.

Трэба адзначыць, што сайт не заўсёды быў такім, якім прадстае перад вачыма цяпер. Ён змяняўся і гэта натуральна, бо жыццё ўносіць свае карэктывы. Сённяшняму наведвальніку **svaboda.org** адкрыецца бела-чырвонае выяўленне, з якога адразу ёсць магчымасць трапіць на такія старонкі сайта, як палітыка, грамадства, культура, чалавек. А яны ў сваю чаргу маюць яшчэ меншыя старонкі, некаторыя з якіх, на жаль, даўно не абнаўляліся. Унізе галоўнай старонкі можна ўбачыць апошнія тэмы, пра якія Радыё Свабода распавядала ў адпаведных аналітычных і публіцыстычных перадачах. Думаю, не варта тлумачыць, колькі карысных для сябе думак і поглядаў іншых людзей, цікавых абставін іх жыцця і дзейнасці, гістарычных падзей і аналогій адкрые віртуальны госць Радыё Свабода.

Уладзімір Лапцэвіч

Беларусь, беларусы

Цікавасць да Аўгустоўскага канала

Як паведаміла агенцтва Белапан, беларускі бок прыняў адпаведны ўказ, які тычыцца рэканструкцыі часткі Аўгустоўскага канала пракладзенага па Гродзенскай вобласці. Згодна ўказу да 1 ліпеня 2006 года ўсе працы мусяць быць завершаны і адкрыецца пункт пропуску праз дзяржаўную мяжу.

Супрацоўніцтва памежнікаў

23 студзеня ў Аўгустове адбылося трэцяе двухбаковае пасяджэнне Польска-беларускай падкамісіі па справах памежнага супрацоўніцтва.

Удзельнікі пасяджэння абмеркавалі ступень рэалізацыі ранейшых пагадненняў па недапушчэнню і прадухіленню магчымых надзвычайных сітуацый у памежных раёнах. Былі разгледжаны прапановы трансгранічных дзеянняў спрыяючых бяспецы пры транспартоўцы небяспечных рэчываў, супрацоўніцтва падчас аварый на прамысловых прадпрыемствах, вытворчасці і ўвозу на памежныя тэрыторыі прамысловай сыравіны і генетычна мадыфікаваных прадуктаў. Паведаміла Падляшская ваяводская ўправа.

Апазіцыянераў — пад пільны дагляд

Студзеньская паездка лідараў беларускай дэмакратычнай апазіцыйнай кааліцыі „5+" у Варшаву не абыйшлася без інцыдэнта. Што, дарэчы, стала справай рук беларускіх мытнікаў, якія праглядзеўшы ручную кладзь кожнага палітыка, вывелі на асабісты дагляд былога старшыню Вярхоўнага Савета С. Шушкевіча і прафсаюзнага актывіста, старшыню Беларускай партыі працы А. Бухвостава. Па словах Шушкевіча, мытнікі хацелі праглядзець ягоную кампютэрную дыскету, якую ў знак пратэсту, матывуючы яе змест уласнай перапіскай, палітык паламаў і выкінуў.

У Варшаве апазіцыйныя актывісты мелі сустрэчы з былым міністрам абароны Янушам Анышкевічам, прадстаўнікамі польскага МЗС і кіраўніцтвам палітычных партый. Як паведамілі на прэс-канферэнцыі ў Мінску лідэры кааліцыі, Польшча, са слоў міністра У. Цімашэвіча, гатова пайсці на змякчэнне візавага рэжыму, яшчэ раз прапанаваўшы афіцыйнаму Мінску „ўкраінскі" варыянт. Паведамляе www.ucpb.info

Факты

Таварыства беларускай культуры (ТБК) Літвы правяло 11 студзеня справаздачна-выбарчую канферэнцыю. У дзейнасці Таварыства за апошнія два гады шмат станоўчага — праведзены шматлікія імпрэзы, сходы, пікеты, экскурсіі і г.д. Шмат робіцца па ўшанаванню беларускіх мясцін у Вільні (памятныя дошкі, крыжы, захады па аднаўленню музеяў).

Старшынёй Рады ТБК зноў абраны Хведар Нюнька.

*

Газета беларусаў Літвы „Рунь" у сваіх нумарах працягвае друкаваць „Мартыралог Віленскага краю". Грамадскасці прадстаўлены ўжо прозвішчы звыш 120-ці чалавек, з большага жыхароў колішняй Віленскай губерні, якія былі рэпрэсаваныя бальшавіцкай уладай.

*

100-гадовы юбілей адсвяткавала нарыканцы мінулага года беларуская вёска Чарчэт Іркуцкай вобласці Расіі. Заснаванае перасяленцамі гэтае сібірскае паселішча захавала сваю беларускую адметнасць. Нават гаворка акурат такая як у сённяшняй крыху зрусіфікаванай вёсцы ў Беларусі. Паведамляе „Маланка" (бюлетэнь Іркуцкага таварыства Беларускай культуры імя Чэрскага).

*

Суполка калінінградскіх беларусаў „Каралявец" намагаецца паставіць у гэтым расійскім горадзе помнік Францыску Скарыне. Арганізацыйныя пытанні з мясцовымі ўладамі ўлагоджаныя, засталіся фінансавыя, у вырашэнні якіх дыяспара спадзяецца на дапамогу беларускага ўрада. Паведаміла Радыё Свабода.

*

Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны стала пад пагрозай апынуцца на вуліцы. Рашэннем адміністрацыі Партызанскага раёна Мінска беспадстаўна, на думку ТБМаўцаў, разрываецца дагавор аб арэндзе памяшкання, дзе месціцца офіс арганізацыі. Такая страта па ўсёй верагоднасці стане падставай для ліквідацыі Таварыства. З гэтай нагоды ТБМ распаўсюдзіла зварот да грамадзян Беларусі.

*

6 студзеня памёр выдатны паэт беларускай эміграцыі Янка Юхнавец. Родам з-пад Докшыц ад 1944 года жыў у Германіі, а потым у ЗША. У 1994 годзе ягонай кнігай „Сны на чужыне" мінскае выдавецтва „Мастацкая літаратура" адкрывала літаратурную серыю „Галасы беларускага замежжа". Паведамляе baza-belarus.org (вал)

Аб сустрэчы з рэктарам ВУ

19 студзеня 2004 года пасол Беларусі ў Польшчы Павел Латушка ініцыятыўна сустрэўся з рэктарам Варшаўскага універсітэта прафесарам Пятром Венгленьскім.

У размове былі абмеркаваны пытанні супрацоўніцтва паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Варшаўскім універсітэтам, у прыватнасці, наладжванне актыўнага абмену паміж навучальнымі ўстановамі, правядзенне сумесных даследаванняў, стажыровак студэнтаў і выкладчыкаў, рэалізацыі навуковых праектаў.

Суразмоўцы падкрэслілі неабходнасць узнаўлення практыкі абмену для навучання і моўных стажыровак для студэнтаў філалагічных факультэтаў БДУ і Варшаўскага універсітэта, якія займаюцца адпаведна паланістыкай і беларусістыкай.

Рэктар Варшаўскага універсітэта выказаў думку аб мэтазгоднасці заключэння новага пагаднення аб супрацоўніцтве паміж вядучымі універсітэтамі Беларусі і Польшчы, у якім, побач з далейшым развіццём сувязей у гуманітарнай сферы, неабходна прадугледзець пытанні развіцця эканамічнага супрацоўніцтва.

Дасягнута дамоўленасць аб правядзенні ў Варшаве ў першай палове г.г. сустрэчы рэктараў БДУ і Варшаўскага універсітэта.

Прэсавы бюлетэнь Пасольства РБ

Той, хто прагне ўлады

Паўгадзінны фільм Ю. Каліны, што быў паказаны 19 студзеня па TVP 1 цалкам адпавядаў сваёй назве, а дакладней таму пытанню, якое гэтай назвай і з'яўляецца. „Апошні дыктатар Еўропы?" — гэтак, праўда без пытальніка, называюць сённяшняга кіраўніка беларускай дзяржавы апазіцыянеры. Некаторыя кажуць больш стрымана — аўтакрат, іншыя як мае быць згодна пасадзе, — дэмакратычна і ўсенародна абраны прэзідэнт.

Фільм пачынаўся даволі цікава — пералівамі царкоўных званоў, якія суправаджалі кадры разгону дэманстрантаў, Плошчы Незалежнасці ў Мінску, прысягаючага на Канстытуцыю А. Лукашэнку, якая потым імжа і была парушана. „Царкоўная" тэматыка перайшла ў расповед мастака Аляксандра Пушкіна аб тым, як ён намаляваў у сваёй вясковай царкве постаці цяперашняга прэзідэнта і мітрапаліта Філарэта як найгоршых, з яго пункту погляду, грэшнікаў. У той жа час словы вясковай бабулі аб тым, што „хто з нас без граха?" абазначыў паказанае далей іншае стаўленне да А. Лукашэнкі ў шмат каго ў Беларусі.

Гісторыя прыходу Лукашэнкі да ўлады, што пададзена ў фільме адпавядае рэчаіснасці — народ сапраўды быў стомлены ад нямоглых „дзяржаўных дзеячаў", большасць з якіх цікавіў не дабрабыт насельніцтва, а ўласная магчымасць прыдбаць былую „агульнанародную" маёмасць. Таму тэма барацьбы з карупцыяй, з якой пайшоў на першыя і пакуль адзіныя дэмакратычныя прэзідэнцкія выбары колішні дырэктар далёка не перадавога саўгаса, аказалася самай выйгрышнай. Праўда, ад слоў да справы не дайшло — практычна ўсе, хто быў на чыноўніцкіх пасадах „пры камуністах" на іх засталіся і „пры Лукашэнку". Цалкам адроджаныя савецкія парадкі і адміністрацыйна-камандная сістэма прымушаюць сумнявацца ў праўдзівасці выказаных у фільме слоў беларускага прэзідэнта, што ён ішоў на выбары ад апазіцыі. Калі ж з гэтым згадзіцца, улічваючы колішняе ўнясенне ў залу пасяджэнняў Вярхоўнага Савета групай дэпутатаў, сярод якіх быў і Аляксандр Рыгоравіч, бел-чырвона-белага сцяга, то прыходзіш да здзіўлення, як улада можа памяняць чалавека. А дакладней разбэсціць яго. Бо чым-чым, а нацыянальнымі сімваламі грэбаваць можа той, для каго яны нічога не значаць, так сама як не значаць уласныя словы і абяцанні. На жаль, магчыма, з-за тэхнічных складанасцей гэтыя моманты беларускай гісторыі засталіся па-за кадрамі. Як засталіся па-за кадрамі і найноўшыя моманты беларускай палітыкі — пераарыентацыя ад прапаганды інтэграцыі з Расіяй да насаджэння „ідэалогіі беларускай дзяржавы". Апошняе з большага варта ўспрымаць станоўча — бо яно, у рэшце рэшт, спрыяе як мацаванню беларускай дзяржаўнасці, так і самаідэнтыфікацыі беларусаў, многія з якіх працягваюць лічыць сябе „савецкім народам" аж дагэтуль.

З усяго гэтага вынікае, што адказам на пытанне-назву фільма можа быць сцвярджэнне — Лукашэнка гэта не столькі дыктатар, колькі той чалавек, які прагне ўлады мацней, чым хтосьці іншы з 10 млн. насельніцтва Беларусі.

Уладзімір Лапцэвіч

Юрыдычны даведнік

З гэтага нумара ў рамках рубрыкі „Дапамагаем з «Нівай»" адкрываем куточак з юрыдычнымі, лекарскімі і кулінарнымі парадамі. Чытачам запрапануем поўнае ўражанняў падарожжа цераз джунглю законаў, доктарскіх таямніц аж да салодка-горкіх, часам дапраўленых шчопцю гумару, кулінарных рэцэптаў. Шчыра спадзяемся, што ўзнятыя намі тэмы зацікавяць чытачоў і выклічуць новыя пытанні, якія пастараемся супольна высветліць. На пачатку кожнага месяца на нашы пытанні будзе адказваць юрыст ПЯТРО ЮШЧУК.

— Вялікім зацікаўленнем ад амаль дзесяці гадоў карыстаюцца крэдыты, аднак многа людзей, не думаючы аб паслядоўнасцях сваіх рашэнняў, згаджаюцца стаць паручыцелямі. Потым аказваецца, што добры сябра, або нават член сям'і, не плаціць ратаў. Што тады рабіць паручыцелю?

Пятро Юшчук: — Нельга адмовіцца ад сплаты крэдыту, калі пры заключэнні крэдытнага дагавору мы выступалі паручыцелямі (жырантамі), па простай прычыне: крэдытор будзе патрабаваць ад паручыцеляў сплаты пазыкі судовым шляхам. Аднак, калі пры падпісанні крэдытнага дагавору наступіла памылка, калі паручыцель не ведаў, якія дакументы падпісваў, значыць, быў уведзены ў зман і несвядома паставіў подпіс, або калі быў хворы і не мог свядома рашаць аб сваіх паводзінах, тады ёсць магчымасць пазбегнуць выканання абавязацельстваў. Пакрыўджаны паручыцель можа на працягу года падаць заяву аб прадухіленні ў адносінах да яго асобы юрыдычных паслядоўнасцей крэдыту.

— Ці ў сітуацыі, калі сябра хоча пазычыць ад нас грошы, і мы, хаця яму давяраем, можам неяк забяспечыцца, напрыклад, папрасіць нешта пад заклад?

— Напэўна трэба заключыць дамову, якая сама па сабе з'яўляецца падставай для законных дзеянняў. Памятаць трэба прытым, што дамова павінна быць састаўлена прынамсі ў двух экземплярах, па адным для кожнага з бакоў. Перасцерагаю аднак перад браннем нечага пад заклад. Паводле законаў, будзе гэта нелегальны ламбард, а вядзенне гэтага тыпу гаспадарчай дзейнасці без рэгістрацыі з'яўляецца злачынствам.

— А аб чым павінен памятаць звычайны грамадзянін падпісваючы крэдытны дагавор?

— Галоўнае — добра і спакойна прачытаць дамову, звяртаючы ўвагу на працэнты, няўстойку (штраф і пеню) і тэрміны пагашэння пазыкі. У сітуацыі, калі ў дамовах патрабуецца папярэдняя перадаплата, якая з'яўляецца гарантам пазнейшага атрымання крэдыту, павінны мы быць свядомымі, што датычыць гэта нейкай лёсавай сістэмы, а не банкаўскага права. Называецца гэта часта аргенцінскай сістэмай, у якой паасобныя дзялкі згодна з правам узбагачаюцца коштам наіўнасці звычайных грамадзян, бо толькі банкаўскае права поўнасцю рэгулюе праблему суб'екта, дзе інтарэсы пазыкаатрымальніка ахоўваюцца законам. Праблемы дамоваў вырашае Цывільны Кодэкс (артыкулы 58-80) і на яго трэба абапірацца.

— Дзякую за размову і парады.

Гутарыла Паўліна Шафран-Асташэвіч

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, адкрываем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". У кожным нумары будзем друкаваць актуальныя прапановы павятовых устаноў па працаўладкаванню (ПУП) з Беластока, Гайнаўкі, Саколкі, Сямятыч і Бельска-Падляшскага. Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ДАМ ПРАЦУ

ПУП у Гайнаўцы, вуліца Пілсудскага, 10 а, тэл. 682-23-18

• хімік — спецыяльнасць гальванізацыя,

• сантэхнік — патрабаванні: пяць гадоў стажу ў прафесіі, будаўнічыя правы ў санітарнай тэхніцы,

• кухар — санітарны мінімум, кніжка здароўя, вопыт,

• бармен — санітарны мінімум, кніжка здароўя, вопыт,

• лектар англійскай мовы — заняткі пасля ўрокаў у дзіцячым садку і школах, вышэйшая або сярэдняя адукацыя, дакумент сцвярджаючы веданне англійскай мовы,

• вахцёр (recepcjonistka) — веданне англійскай або нямецкай мовы.

ПУП у Саколцы, вул. Крынская, 40, тэл. 711-56-46

• конкурс на пасаду „старшыня кааператыва", працоўны стаж — 10 гадоў, у тым 5 гадоў на кіраўнічай пасадзе, вышэйшая адукацыя, вадзіцельскія правы катэгорыі АВ, веданне дзейнасці прадпрыемстваў на рынку,

• дрывасек-аператар пілы — правы да выконвання прафесіі,

• кандытар-пірожнік — прафесійная адукацыя, стаж,

• асяроддзевая медсястра — сярэдняя медыцынская адукацыя, закончаныя курсы на асяроддзевую медсястру,

• работнік у гадаўляна-аграрнай гаспадарцы — патрабаванне адно: ахвота да працы,

• бухгалтар — вышэйшая адукацыя, стаж працы.

ПУП у Беластоку, вуліца Сянкевіча, 82, тэл. 741-51-81

• пісар — з кваліфікацыямі,

• эканамічны працаўнік — веданне рахункаводства, эканамічнага аналізу рынку,

• акушэрка.

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Студэнтка апошняга курса маркетынгу шукае працу ў Бельску-Падляшскім, вадзіцельскія правы кат. В, добрае веданне англійскай мовы, абслуга камп'ютэра (праграмы Microsoft Word, Excel), мае шмат часу, тэл. 0602769109.

• Студэнт V курса рускай філалогіі шукае працу ў Гайнаўцы, правы кат. В, добрае веданне рускай і беларускай моў, абслуга камп'ютэра, аператыўны і з ахвотай да працы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0606431022.

• Жанчына (43 г.), тэхнічная адукацыя, закончаны курсы камп'ютэрнага рахункаводства, правы працы і экатурызм, добрае веданне рускай і беларускай моў, абслуга камп'ютэра, шмат часу, тэл. 7304000 (Бельск-Падляшскі).

• Мужчына (35 г.), сярэдняя адукацыя, 16 гадоў працы столярам, правы кат. В, уласная машына, уласная майстэрня і матэрыялы, шукае новых кліентаў, зацікаўленых апрацоўкай хат у драўніне, арганізацыяй забудовы панадворкаў, індывідуальны падыход да кожнага кліента, маю вялікі вопыт у царкоўным будаўніцтве, тэл. 7303389 (Бельск-Падляшскі).

• Студэнтка шукае працу ў Беластоку, стаж працы ў магазіне, добрае веданне рускай і англійскай моў, абслуга камп'ютэра, арганізацыйныя здольнасці, добры падыход да дзяцей (інтым і сецевы маркетынг не прапанаваць), тэл. 0692687442.

• Студэнтка (23 г.) ахвотна заапякуецца малым дзіцём у ранніх гадзінах, Беласток (інтым і сецевы маркетынг не прапанаваць), тэл. 7445293.

Беспрацоўе гэта не адна праблема, з якой трэба востра змагацца, аднак якраз яно мае непасрэдны ўплыў на матэрыяльную сітуацыю многіх людзей. У рамках рубрыкі „Дапамагаем з «Нівай»" будзем бясплатна змяшчаць аб'явы людзей, якія патрабуюць дапамогі і людзей, якія такую дапамогу могуць аказаць. Адзначаю прытым, што не звяртаемся з просьбай перадаваць грошы патрабуючым, бо амаль усе адчуваем іх недахоп, аднак кожны з нас мае ў хаце непатрэбныя рэчы: паношанае, але не знішчанае адзенне, з якога выраслі ўжо дзеці, боты, пасцель, коўдры, стары халадзільнік, тэлевізар або чайнік. Гэтага бракуе некаторым... Маем надзею, што сярод нашых чытачоў знойдуцца ахвяравальнікі, якія ад шчырага сэрца падзеляцца з патрабуючымі, а гэта шмат не каштуе. Мы штотыдзень будзем друкаваць па некалькі такога тыпу аб'яў.

• Сям'я патрабуе цёплых, зімовых куртак для дзяўчат ва ўзросце 10, 12 і 13 гадоў.

• Адзінокая маці, якая выхоўвае трое дзяцей, патрабуе цёплага адзення для 12-гадовага хлопца і для 15-гадовых дзяўчат, пледаў і пасцелі.

• Сям'я, якая выхоўвае сямёра дзяцей, будзе ўдзячная за ўсякую дапамогу (адзенне, пасцель, старая мэбля).

• Сям'я з дзесяці асоб патрабуе пледаў, пасцелі, цёплага адзення для дзяцей.

Больш інфармацый пад нумарам тэл. 7121153.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры, як і іншае нязнішчанае адзенне, інфармацыя пад тэл. 7304000.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Абвесткі

Беларуская песня 2004

Чарговыя павятовыя агляды XI Агульнапольскага фестывалю „Беларуская песня 2004" адбудуцца:
— 1 лютага г.г. у Гайнаўскім доме культуры (пачатак а 14 гадзіне);
— 7 лютага ў Гарнізонным клубе ў Беластоку (16 гадз.);
— 8 лютага ў Бельскім доме культуры (14 гадз.).
Цэнтральныя элімінацыі адбудуцца 15 лютага г.г. у Гарнізонным клубе ў Беластоку па вул. Кавалерыйскай, 70 (пачатак а 10 гадзіне) і Гала-канцэрт „Беларуская песня 2004" у зале Спартыўнага клуба „Влукняж" у Беластоку па вул. Антанюкоўскай, 60 (пачатак у 16 гадзін).
Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства шчыра запрашае на мерапрыемствы ўсіх зацікаўленых. (яц)

Пластычная выстаўка ў музеі

Белавежскі нацыянальны парк запрашае глядзець пластычную выстаўку п.з. „Logo Roku Żubra" і „Order Przyjaciół Żubra". Выставу адкрылі ў Прыродазнаўчалясным музеі БНП у Палацавым парку ў Белавежы. Наведваць яе можна штодзённа ад 9 да 16 гадзіны. (яц)

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 393 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2004 r. upływa 5 marca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Афарызмы Ладзіка Майніча

Народ і палітыка

Добра было б, калі б галасы не падлічвалі, а ўзважвалі.
Георг Ліхтэнберг

Калі вярнуць народу нарабаванае, рабоў не паменшае.

Палітыка перніка й пугі прыдатная толькі для рабоў і абслугі.

Падзеньне заўсёды падзея, узьлёт не заўважыць народ.

Удзячныя людзі сустракаюцца не часьцей, чым аазісы ў пустэльні.

Калі чалавеку няма чаго сказаць, ён будзе гаварыць доўга.

Тыя, хто высока задзіраюць нос, ніколі ня бачаць Неба.

Калі ў чалавека ёсьць імя, яму не патрэбныя тытулы.

Выключэньні сярод людзей толькі падкрэсьліваюць іх вылучнасьць.

Дурні заўсёды гавораць, калі трэба маўчаць, разумныя часта маўчаць, калі трэба гаварыць.

Сучасьнікаў становіцца ўсё менш: адныя апярэджваюць свой час, іншыя жывуць у мінулым.

Ніхто ня прагне ўлады так, як тыя, што называюць сябе прагматыкамі.

Каб гаварыць адным голасам, трэба думаць шматбакова.

Малыя ростам мужчыны любяць глядзець на іншых звысоку.

На паядынкі выходзяць адзінкі, іншыя становяцца ў апазыцыю.

Часта войскам кіруе дэгенералітэт.

Працаваць у камандзе намнога складаней, чым камандаваць працай.

Раб думае пра тое, што рабіць, а не пра тое, што зьмяніць.

Журналістыка са старажытнай прафэсыі пераўтварылася ў чацьвёртую ўладу — гэта сьведчыць пра існасьць улады.

Першыя часьцяком забываюць папярэдніх.

За раўнапраўе найбольш змагаюцца маральна непаўнавартасныя асобы.

Яшчэ Эразм Ратардамскі папярэджваў, што часьцей за ўсё перамагае той, каго не ўспрымалі сур'ёзна. Такія прыходзяць усур'ёз і надоўга.

Мясцовая ўлада мае ладныя месцы.

(Правапіс аўтара захоўваецца)

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Акно шэраклетачнае

Сказалі браць справу ў свае рукі. Узяў. Узяў хату. Вялікую, гарадскую, цэлы блок. Клетак у ёй многа, як у вулеі, ды і жыльцоў можна туды набраць як зярнят у гарбуз. Ну і пасяліў я ў ёй масцістыя масцітасці, кожную ў асобную клетку. Не тое, што трусоў. І аплачваю я іх, пятнаццаць злотаў у месяц за ўсіх. І аплачваецца гэта мне, бо гэта народ парадачны і прыстойны. Жывуць згодна там і Адам Малыш, і Ежы Дудэк. І прэзідэнт Буш, і прэзідэнт Тур. І Леў Рывін, і Тыгр Міхальчэўскі. І Брытні Спірс, і Памэла Андэрсан. І доктар Кшаклеўскі, і магістр Квасневскі. І прэм'ер Мілер, і цар Пуцін. І Анна Курнікава, і Майк Тайсан. І многа яшчэ слаўнага народу там жыве, нават усіх не помню. Але неадкладна сабе прыгану. Яшчэ сёння, зараз. Сяду перад тэлевізарам і ўглядацца буду пільна, хто там яшчэ жыве. І заўтра буду сядзець, і паслязаўтра, і нават спаць буду перад тэлевізарам, бо гэта акно ў тую маю гарадскую хату. І яшчэ, як у старым шатландскім палацы, у маёй хаце жыве дух, дух таварыша Герка. Але не палохае ён, толькі просіць дапамагчы яму нам. Каб усім, нават тутэйшым, быў і хлеб, і скварка, і чарка. А клеткі мае тыя шэрыя-шэрыя. І бетонныя яны, бетоннейшыя. І акон у шэрыя клеткі маёй сваёй хаты не адкрываю. Бо калі б дзе там што ды каб не таго. Мая ж хата з краю.

Цім Паводзін

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

У цягніку кавалер зачапляе дзяўчыну:

— Падарожнічае па справе ці дзеля прыемнасці?

— Дзеля прыемнасці, але не вашай.

* * *

Рассеяны мужчына выбраўся падарожжа чыгункай. Зайшоўшы ў купэ стаў нервова перашукваць кішэні.

— Чаго вы шукаяце? — спытаў адзін спадарожнік.

— Не магу знайсці білета...

— Пашукайце старанна, бо ў выпадку кантролю заплаціце штраф.

— Гэта дробязь! Мне трэба даведацца, куды еду.

* * *

Гутараць два старэйшыя сябры:

— Хацеў бы сёння мець столькі грошай, — кажа адзін, — колькі калісь прапусціў з прыгожымі дзяўчатамі...

— І на што б іх прызначыў?

— А мала сёння прыгожых дзяўчат?

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Марлены Дзітрых.

1. паселішча на Каўказе і ў Сярэдняй Азіі ды ў ... Барнауле =
18 __ 70 __ 59 __;
2. узброенае сутыкненне =
42 __ 43 __ 16 __;
3. белая не ў Белавежы, але ў Камянцы, пабудаваная ў 1271-89 гг. =
11 __ 15 __ 13 __ 12 __;
4. адзінка мясцовага самакіравання, напр. у Орлі =
36 __ 44 __ 35 __ 14 __ 5 __;
5. скураная пятля ў хамуце для прымацавання аглобляў да вупражы („... не гавары, што не дуж") =
4 __ 45 __ 6 __;
6. злы дух у персідскай і арабскай міфалогіях, або гарэлка прыпраўленая ядлоўцам = 61 __ 20 __ 67 __ 22 __;
7. Барыс, папярэднік Пуціна =
26 __ 52 __ 74 __ 39 __ 28 __ 25 __;
8. муж дачкі =
62 __ 19 __ 9 __ 10 __;
9. зброя рыцара = 29 __ 37 __ 27 __;
10. шэры грызун, прычэплены да ... камп'ютэра = 68 __ 40 __ 17 __;
11. шар для гульні, напр. у валейбол = 51 __ 60 __ 66 __;
12. іншасказальнае апавяданне з павучальным вывадам, напр. пра блуднага сына = 1 __ 2 __ 3 __ 32 __ 47 __ 72 __;
13. гомельская рака = 8 __ 7 __ 46 __;
14. месца заслоненае ад сонца =
64 __ 63 __ 49 __ 65 __;
15. колішні ром, які жыў у табары =
73 __ 48 __ 58 __ 50 __ 31 __;
16. гарбата = 55 __ 21 __ 57 __;
17. паўднёваамерыканская „доўгая" дзяржава са сталіцай у Сант'яга =
23 __ 24 __ 34 __ 30 __;
18. рай (Быццё 2: 8, 10) =
56 __ 69 __ 33 __ 71 __;
19. авечаня = 53 __ 54 __ 38 __ 41 __.

(Ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 50 нумара Міра Лукша.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

						1	2	3	4
5	6	7	8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	31	32	33	34
35	36	37	38	39	40	41	42	43	44
45	46	47	48	49	50	51	52	53	54
55	56	57	58	59	60	61	62	63	64
65	66	67	68	69	70	71	72	73	74

Што цябе чакае ў 2004?

Казярог (22.XII — 19.I). *Экзамен з жыцця — на пяць!* Год лёгкі, добры, разнавідны, дынамічны, з поспехам і шчасцем. Зважай на фальшывых сяброў. Знакаміта на працы і ў фінансах. Прыліў сіл.

Вадалей (20.I — 18.II). *Неспакойны дух, прытармазі сваю прагу незалежнасці!* Новыя знаёмствы, рэвалюцыйныя змены. Увесь год — адчайна хуткі, гарачы. Менш крытычна ацэньвай людзей. На працы — год дынамічны і парадкавання прафесійных спраў. Інвестуй у адукацыю!

Рыбы (19.II — 20.III). *Жыццядайная энергія, творчае ўяўленне, тонкасць і паслядоўнасць у дзеянні.* Усё, што запланаваш, будзе мець шанц поспеху. Можаш усё! Але ступай цвёрда па зямлі! Магчымае перасяленне. Вялікія поспехі ў прафесійнай сферы жыцця. Ашчаджайся з ежай, добра спі. Зважай на лёгкія, пі вітамін В.

Баран (21.III — 20.IV). *Не бойся рызыкі — у надыходзячым годзе час на вялікія змены!* Давярай інтуіцыі, здзейсніш свае мары. На працы — значная паправа фінансаў, але грошай не распускай. Магчымасць заснаваць сваю фірму. Добры час пазбыцца цягі да цыгарэт ды гарэлкі.

Бык (21.IV — 21.V). *Сапраўдны кіпень пачуццяў!* Шмат неспадзяванак. Магчымая змена працы. Добры год на планаванне пабольшання сям'і. Будзеш захапляць кампанію! Карысны час на працы. Добрае здароўе.

Блізняты (22.V — 20.VI). *Год спроб, выклікаў і пошукаў.* Пачатак года цяжкі і працавіты. Зменіш сваё настаўленне да сябе і свету. Моцна расхваляваныя эмоцыі. Будзь больш талерантны! Разважліва прымай рашэнні. Добрыя ацэнкі. Гарантаваны поспех у фінансах. Цяжкасці з нервамі, кровазваротам.

Рак (21.VI — 22.VII). *Змагайся з выклікамі, шукай красы і гармоніі!* Задавальненне ў прафесійным і асабістым жыцці. Шмат сілы. На працы — павага і фінансавыя карысці. Узмацненне сямейных сувязяў, гармонія. На працы — паправа. Будзеш кіраваць сваім лёсам. Не бойся рызыкі ці няўдачы. Больш рухайся.

Леў (21.VII — 22.VII). *Творчае захапленне, жарсці, але і шмат цяжкай працы.* Маеш у сабе моц! Асабліва шчаслівы і ўдалы год. Завершыш шмат спраў. Спелыя, свядомыя пачуцці. Магмымасць рэалізацыі новых ідэй. Фінансы някепскія. Кінь шкодныя звычкі.

Дзева (23.VIII — 22.IX). *Перад табою год пошукаў і ўнутраных перамен.* Шмат новых спроб, неспадзяванак, выклікаў, знаёмстваў. Важныя жыццёвыя выбары. Шмат абавязкаў і выклікаў. Інвестуй грошы.

Шалі (23.IX — 23.X). *Благія хвіліны ўжо мінулі, аптымістычна і з верай глядзі ў будучыню!* Час новых перспектыў і карысных рашэнняў. Возмеш руль у свае рукі! Справішся з усім. Шанцы, якія трапляюцца раз на пару гадоў! Час радыкальных змен. Не ўлазь у даўгі. Добрае здароўе (але магчымасць пераломаў і траўмаў).

Скарпіён (24.X — 21.XI). *Хуткі тэмп жыцця і новыя выклікі — усё тое, што ты любіш!* Шмат неспадзяванак. Выкарыстай усё. Усё кончыцца перамогай. Кантралюй выдаткі. Выйдзеш з усіх крызісных сітуацый. Росквіт кампанейскага жыцця. Планы здзейсніш.

Стралец (22.XI — 21.XII). *Чакае цябе жыццё са смакам вялікіх прыгод!* Шмат змен і падзей. Урэшце ўзяў ты лёс у свае рукі! Вялікія ўнутраныя перамены. Адвага, сіла. Новыя, патрабавальныя, нялёгкія выклікі. Энергія. Пад канец года — карысці. Асцярожна з алкаголем.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960